WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 САКАВІКА 2011 г.
АЎТОРАК
№ 52
(26916)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«Прамая лінія»

ЖЫЦЦЁ З АЛЕРГІЯЙ

Гэта паталогія даволі частая і сустракаецца ў кожнага пятага жыхара зямлі. Алергія — гэта не толькі цяжкія захворванні, напрыклад, бранхіяльная астма, але і рыніт, крапіўніца, іншыя хваробы. Вельмі шмат алергенаў знаходзіцца ў памяшканнях, дзе мы жывём. Як вынік — бытавыя алергены ўздзейнічаюць на чалавека круглы год.

Людзям, схільным да алергічных рэакцый рознага паходжання, трэба прытрымлівацца пэўных правілаў у штодзённым жыцці. Якіх? Пра гэта мы пагаворым на нашай чарговай «прамой лініі», у якой прыме ўдзел кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла Вячаслаўна Маслава. Прамая лінія адбудзецца **23 сакавіка**, у сераду, **з 13.00 да 14.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21**. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: **8 (017) 287 18 29 і 287 18 36**.

«Online-марафон»

ПЕНСІІ, БЯСПЕКА ПРАЦЫ, САЦПАДТРЫМКА

Бліжэйшым часам Міністэрства працы і сацыяльнай абароны наладзіць чарговы «online-марафон», удзел у якім могуць узяць усе жыхары нашай краіны.

Як паведаміла **прэс-сакратар міністэрства Варвара АЛЕКСАНДРОВІЧ**, у рамках «online-марафона» запланавана правядзенне інтэрактыўных канферэнцый. **22 сакавіка,** — падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, стажыроўцы, павышэнню кваліфікацыі і праверцы ведаў работнікаў па ахове працы, а **29 сакавіка,** — пытанням сацыяльнай абароны пажылых людзей, ветэранаў і інвалідаў. Прычым у гэтыя дні ўсе тры канферэнцыі пройдуць у аднолькавы час — **з 11.00 да 12.30.**

Дарэчы, нагадала Варвара Александровіч, задаць сваё пытанне спецыялістам міністэрства зможа кожны. Непасрэдна ў дзень і час правядзення канферэнцый зрабіць гэта магчыма праз сайт **www.mintrud.gov.by (раздзел «Інтэрактыўныя канферэнцыі»)**, а напярэдадні — праз e-mail: **press@mintrud.gov.by** або па **факсе (8-017) 306-38-84 (з адзнакай «online-марафон»)**.

Сяргей ГРЫБ.

ПОМПУ НАРЭШЦЕ ЗАМЯНІЛІ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Святлана Сяргееўна Кульша з вёскі Плешчаніцкая Слабада Лагойскага раёна паскардзілася ў рэдакцыю на праблемы з вадой, і не толькі.

— Яшчэ 7 сакавіка, як нам патлумачылі, згарэла помпа. І яе ўсё ніяк памяняць не могуць. І вады няма, і каналізацыя не працуе, а ў нас яшчэ і ацяпленне паравое. Тэлефанавалі ў дыспетчарскую камунгаса, там нічога канкрэтнага сказаць не могуць, — распавяла заяўніца.

Звярталася ў рэдакцыю яна ў канцы мінулай пятніцы. Гаварыла, што пакуль адны дома, яшчэ неяк абыходзяцца, але на выхадныя павінны прыехаць дзеці. І як вялікай сям'і ў такіх умовах правесці гэтыя некалькі дзён? У той жа дзень мы паспелі пагутарыць з намеснікам дырэктара РУП «Лагойскі камгас» Аляксандрам РАДЗЕВІЧАМ. Той пацвердзіў існаванне праблемы, у прыватнасці, яна тлумачылася адсутнасцю фінансаў. Аднак запэўніў, што заяўка на патрэбнае абсталяванне будзе накіравана паўторна і ўжо ў панядзелак патрэбныя работы будуць выкананы. Бліжэй да абеду ў панядзелак мы яшчэ раз патэлефанавалі Аляксандру Іванавічу.

— Сродкі былі выдзелены, патрэбную помпу набылі, работы па яе ўстаноўцы ўжо вядуцца, — сказаў суразмоўца. — Думаю, да канца дня ўсё будзе зроблена.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Погляд

БЕЛАРУСКІ ЦІ РАСІЙСКІ?

На пачатку мінулага тыдня ў Баранавічах былі праблемы з набыццём валюты, але ўжо ў пятніцу, суботу і нядзелю долары і еўра ў абменных пунктах прадаваліся. Вялікіх чэргаў не было, але ж збітых з панталыку людзей супакоіць нялёгка.

Калі чутка распаўсюджваецца, то ніякіх доказаў не трэба.

Зазірнуў у інтэрнэт і прачытаў, што адзін вядомы нам аналітык прапануе перайсці на расійскі рубель. На яго думку, гэта вырашыць нашы праблемы, а ад нацыянальнай валюты ўсё роўна давядзецца адмовіцца. Але ў найноўшай гісторыі Беларусі расійскі рубель ужо абяцалі ўвесці. Напомню, што былы прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч у свой час выношваў ідэю адмовіцца ад нацыянальнай валюты і нават абяцаў абмяняць беларускія рублі па курсе адзін да аднаго. Пазней і расійскае кіраўніцтва вярталася да гэтай ідэі, але беларускі бок прытрымліваўся сваёй пазіцыі — настойваў на двух эмісійных цэнтрах, у Маскве і Мінску. А такі варыянт ужо не падыходзіў расіянам.

Хачу адзначыць, што ад распаду Саюза ніводная з новых краін, створаных на постсавецкай прасторы, як і на тэрыторыі былой Югаславіі, не праявіла жадання адмовіцца ад сваёй валюты і ўвесці чужую...

З Расійскай Федэрацыяй тавараабарот Беларусі складае 48%, але ж у нас з Расіяй адмоўнае сальдо. Толькі за студзень 2011 года яно дасягнула 448 млн долараў. І калі ўвесці ў Беларусі расійскі рубель — гэтага мінуса ўжо не будзе? Што зменіцца? Масква за нашы прыгожыя вочы грошы не дасць! А тут з'яўляецца чарговы аналітык, які зноў вяртаецца да зашмальцаванай ідэі. З увядзеннем валюты суседняй краіны Беларусь будзе звязана «па руках і нагах» — фактычна згубіць свой суверэнітэт. Вось такая была б цана ўвядзення расійскага рубля ў нашай краіне, і не думаю, што аналітык не ведаў гэтага, калі зрабіў сваю выснову. Гэта некалі Ленін думаў пра Беларусь, а сёння, калі ўсё вымяраецца рублём, кожная краіна павінна найперш сама паклапаціцца пра сябе.

У Масквы свае інтарэсы, і яна іх адстойвае планамерна. У. Пуцін заяўляе, што з уступленнем Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА) для краін Мытнага саюза гэта добра. І тут не важна, хто першы ўступіць, бо ніякіх «шэрых» схем няма. А я думаю, што гэты момант вельмі важны. У СГА ёсць прынцыпы, якіх гэтая арганізацыя прытрымліваецца. Напрыклад, краіны, якія ўваходзяць у СГА, атрымліваюць рэжым найбольшага спрыяння для гандлю. Расія ўступае першай у гэтую арганізацыю. А якая роля ў такім выпадку будзе адведзена Беларусі ў Мытным саюзе? Хацелася б больш канкрэтыкі.

Беларусь не хоча быць непрыкметнай еўрапейскай краінай — у нас ёсць пэўныя амбіцыі. І каб іх ажыццявіць, патрэбны грошы. Наша фінансавая сістэма знаходзіцца пад пастаянным ціскам «планаў грамаддзя», а адмовіцца ад іх тыя ж амбіцыі не дазваляюць. А нам неабходна прывесці нашу вялікую гаспадарку ў норму — у адпаведнасці з нашымі магчымасцямі. Прасцей кажучы, настаў час падцягнуць паясы. У суседніх краінах насельніцтва прайшло праз непапулярныя меры, а беларусы апошнія 15 гадоў жылі даволі прывольна.

Будзем жыць па сродках, не будзем распыляць грошы направа-налева — і многія праблемы адпадуць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕЧУКА.

ПАСЯЎНЫ СТАРТ

У асобных гаспадарках паўднёвых раёнаў Брэсцкай вобласці ўжо прыступілі да сяўбы яравых. Сёлета яравую сяўбу плануецца правесці на плошчы больш за 2,4 млн гектараў.

Сфарміраваны асноўныя фонды насення яравых збожжавых і зернебабовых культур у аб'ёме 106 % да патрэбнасці. Таксама ёсць 65 тысяч тон насення страхавога фонду, што дазволіць у выпадку гібелі азімых перасеяць 300 тысяч гектараў. Праўда, паводле слоў **міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Міхаіла РУСАГА**, пакуль што стан азімых спецыялісты ацэньваюць як задавальняючы, на асобных участках у паўднёвых рэгіёнах краіны страты складаюць да 10 працэнтаў.

Што тычыцца тэхнікі, то ў гаспадарках для правядзення вясновых палявых работ ёсць 48 тысяч трактароў, з якіх больш за 8 тысяч — энерганасычаныя. У бліжэйшы час плануецца дадаткова атрымаць 200 новых энерганасычаных трактароў, 250 камбінаваных глебаапрацоўчых агрэгатаў, больш за 200 машын для ўнясення мінеральных угнаенняў і 100 — для хімічнай аховы раслін. Акрамя таго, вельмі задаволены аграрыі айчыннымі машынамі «Раса-05» з GPS-навігатарам, якія дазваляюць дастаткова якасна і хутка ўносіць мінеральныя ўгнаенні. Сёлета, у параўнанні з мінулым годам, іх колькасць на беларускіх палях павялічыцца больш як у тры разы, з трохсот да тысячы.

— Праўда, па выніках мінулага сезона, выкарыстоўваецца энерганасычаная тэхніка недастаткова эфектыўна, — абазначыў праблему Міхаіл Русы. — Можна пахваліць толькі Магілёўскую вобласць. Там кожны такі трактар апрацоўваў да 60 гектараў, у астатніх абласцях толькі каля 30 гектараў. А ўсё з-за таго, што большасць энерганасычаных трактароў працавала толькі ў адну змену. Гэта нікуды не варта. Таму на гэты сезон пастаўлена задача, каб магутная і эфектыўная тэхніка працавала максімальную колькасць гадзін.

Яшчэ адна праблема, якая стаіць перад аграрнай галіной напярэдадні пасяўной, паводле слоў міністра сельскай гаспадаркі і харчавання, — кадравая: не хапае механізатараў. Неабходна 44 тысячы механізатараў. Сёння не хапае каля 6 тысяч. Але выйсце знойдзена і з гэтай сітуацыі.

— У кожным раёне ўжо прапісана — хто, дзе і адкуль будзе дадаткова працаваць, — паведаміў Міхаіл Русы. — Плануем прыцягнуць выпускнікоў ПТВ, механізатараў з прамысловых прадпрыемстваў. Я мяркую, што ўсяго на сяўбе будзе задзейнічана каля 50 тысяч трактарыстаў-машыністаў. Акрамя таго, там, дзе сёння адсутнічаюць кадры, будуць задзейнічаны студэнты 4-х курсаў, якія ў гэты час праходзяць практыку. Яны будуць працаваць на пасадах брыгадзіраў і вядучых спецыялістаў.

Міністр таксама паведаміў, што з лістапада тыя спецыялісты, якія прыступілі да работы пасля двух гадоў адпрацоўкі па размеркаванні і гатовы працягнуць свой кантракт да 5 гадоў, будуць атрымліваць 350 тысяч рублёў дадаткова да свайго заробку. Распаўсюджваецца такі бонус толькі на работнікаў сельскай гаспадаркі.

Беларусь сёлета павінна атрымаць больш за 9 мільёнаў тон збожжа. У планах — павялічыць збор кукурузы, а таксама, улічваючы рост попыту насельніцтва, павялічыць плошчы і пад крупяныя культуры, у прыватнасці, грэчку.

— У нас штогадовае спажыванне грэчкі ў сярэднім ад 17 да 20 тысяч тон, — адзначыў Міхаіл Русы. — Сёлета ж мы паставілі ў гандаль 32 тыс. тон. У гэтым годзе пасяўныя плошчы грэчкі будуць павялічаны да 35 тысяч гектараў, што на 2,8 тысячы гектараў больш, чым летась. Насенне ёсць, плошчы падабраныя. Работу вядзём па поўнай праграме. Ураджай грэчкі чакаецца на ўзроўні не менш 48 тысяч тон, што дазволіць закрыць унутраную патрэбнасць на сто працэнтаў.

На правядзенне ўсяго цыкла палявых работ, пачынаючы з пасяўной і заканчваючы ўборкай, згодна папярэднім разлікам, неабходна 3 трлн 961,7 млрд рублёў. Фінансаванне ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, крэдытаў банкаў і ўласных сродкаў сельгаспрадпрыемстваў. Вялікая ўвага сёлета будзе надавацца якасці насення збожжавых. Як адзначыў міністр, зерне трэцяй рэпрадукцыі ніто сеяць не будзе. Паводле папярэдніх прагнозаў, усе збожжавыя культуры будуць высеяны да 1 мая, бульба і лён — да 5 мая.

Надзея ДРЫЛА.

«Аса» пачынае і выйграе

Земляробы большасці раёнаў Брэсцкай вобласці вядуць падкормку азімых культур, траў на сенакосах і пашах мінеральнымі ўгнаеннямі.

Асабліва актыўна распачалі гэту работу ў гаспадарках Іванаўскага, Пінскага, Пружанскага раёнаў. На многіх палетках з-за вільгаці з тэхнікай яшчэ не ўлезеш. У выйгрышы аказаліся тыя сельгаспрадпрыемствы, якія ў свой час набылі агрэгаты тыпу «Аса» на шынах нізкага ціску. У іх вельмі высокая праходнасць, яны не наносяць асаблівага ўрону пасевам. Гаспадаркі, якія маюць названыя машыны, абяцалі дапамагчы і суседзям. У бліжэйшыя дні на дапамогу аграрыям прыйдзе таксама і сельскагаспадарчая авіяцыя. І хоць апошні спосаб падкормкі вельмі нятанны, даводзіцца лічыцца з прыродай. Тэмпературны рэжым на поўдні краіны хутка мяняецца, таму важна не ўпусціць аптымальныя тэрміны падкормкі раслін.

Паводле інфармацыі **намесніка старшыні абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Аляксея ТРАЦЮКА**, мінеральнымі ўгнаеннямі на сёлетнюю пасяўную гаспадаркі вобласці забяспечаны амаль цалкам. Фосфарныя і азотныя прэпараты, якіх крыху нестае, будуць закуплены, ужо ёсць дамоўленасць з замежнымі прадпрыемствамі. А вось арганікі цяпер нарыхтавана значна больш, чым летась. І на палеткі гэтага ўгнаення ўжо вывезена на мільён тон больш, чым год таму. Спецыялісты адзначаюць таксама, што ў большасці гаспадарак тэхніка практычна падрыхтавана да пасяўной кампаніі.

Пад яравую сяўбу ў вобласці адведзена сёлета 400 тысяч гектараў. З іх 200 тысяч будзе засеяна збожжавымі, 170 тысяч зойме кукуруза. На Івацэвіцкім кукурузакалібровачным заводзе закончана каліброўка насення. Ім будзе забяспечана патрэба ў насенні кукурузы на 80 працэнтаў. Астатняе закупляецца ў далёкім замежжы. Насенне збожжавых у засеках хапае.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЦЁПЛА — ТОЛЬКІ Ў КРАСАВІКУ

Пра гэта на брыфінгу ўчора паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

Сіноптыкі прагназуюць, што ў апошнюю дэкаду сакавіка ў Беларусі чакаецца няўстойлівае надвор'е. Спачатку будзе параўнальна цёпла, бо да сярэдзіны бягучага тыдня наша краіна будзе заставацца на заходняй перыферыі антыцыклона. Таму месцамі будуць ісці ападкі ў выглядзе дажджу, а ў паўночных раёнах — дажджу і мокрага снегу. У аўторак і сераду ўначы і раніцай у асобных раёнах туман, на дарогах галаледзіца. Максімальная тэмпература сёння ўдзень 3—9 цяпла, на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей да плюс 12 градусаў. Уначы ў сераду мінімальная тэмпература ад 2 марозу да 4 цяпла, удзень паветра будзе награвацца да 3—9 цяпла, на паўднёвым захадзе да плюс 10—13.

У чацвер у паўночна-ўсходняй палове краіны, а ў пятніцу ўжо паўсюдна чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу. У пятніцу адбудзецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Уначы 0—7 марозу, удзень — ад мінус 3 да плюс 3. У выхадныя стане яшчэ халадней. У асобных раёнах кароткачасовы снег, на дарогах галаледзіца. У суботу ўначы будзе мінус 4—11, максімальная тэмпература ўдзень — ад 4 марозу да плюс 3. У нядзелю ўначы будзе падмарожваць да мінус 5—11, пры праясненнях нават да мінус 15 градусаў, удзень — ад 2 марозу да 5 цяпла. У апошнія дні сакавіка наша краіна трапіць пад уплыў атлантычных цыклонаў. Амаль паўсюдна будзе ісці невялікі дождж і мокры снег. Уначы прагназуецца ад 0 да 5 марозу, а ўдзень — 0—6 цяпла. Галалёд і галаледзіца.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, у пачатку красавіка ў Беларусь пачне паступаць паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. Істотна пацяплее. Уначы будзе каля 0, пры праясненнях на поўначы да 0 — мінус 5. Удзень ужо плюс 2—10, у першыя выхадныя красавіка па поўдні краіны — да 15 цяпла. Бліжэй да сярэдзіны першай дэкады красавіка час ад часу будзе ісці дождж. Уначы — ад 5 марозу на поўначы, да 4 цяпла на поўдні. Удзень ужо 5—12 цяпла. Потым уначы тэмпература будзе вагацца ад мінус 2 градусаў па поўначы да 5 цяпла на поўдні. Удзень — 7—15 цяпла. Прагназуецца, што ў другой палове красавіка дзённыя максімумы тэмпературы на поўдні краіны будуць дасягаць плюс 17—23. Сіноптыкі падлічылі, што сярэдняя тэмпература красавіка будзе прыкладна блізкай да нормы, месцамі — на 1—2 градусы вышэй за кліматычную норму, якая складае ад плюс 4 на поўначы да 7 цяпла на поўдні краіны. А вось ападкаў чакаецца ў красавіку крыху менш за норму, якая складае 40-51 мм.

Сяргей КУРКАЧ.

ПАДМАНВАЎ ДЗЯРЖАВУ ПРЫ ЗАКУПЕ МАЛАКА

У Віцебскай вобласці заведзена крымінальная справа ў дачыненні дырэктара прыватнага ўнітарнага прадпрыемства, якое займалася закупам малака ў насельніцтва.

Пра несумленную дзейнасць бізнэсмена супрацоўнікі міліцыі, якія змагаюцца з эканамічнымі злачынствамі, ведаюць ужо шмат.

Высветлена, што на працягу пяці гадоў (з 2006 па 2010) з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, ажыццяўляючы фінансава-гаспадарчую дзейнасць па нарыхтоўцы малака ў насельніцтва і рэалізацыі яго адкрытаму акцыянернаму таварыству «Малако», прадпрымальнік падаваў заведама лжывыя дакументы. Рабілася гэта для налічэння надбавак да закупачных цэн па адпаведнай дзяржаўнай праграме, накіраванай на развіццё і падтрымку асабістых падсобных гаспадарак. Крадзеж бюджэтных сродкаў ацэньваецца на агульную суму звыш 50 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВЫСАКАРОДНЫ МЕТАЛ У ЦАНЕ

Сёлета залатыя мерныя зліткі карыстаюцца попытам у беларусаў

Дакладней, попыт на золата ў краіне пачаў павялічвацца бліжэй да канца мінулага года, а ў гэтым ён «б'е» паказчыкі адпаведных месяцаў мінулага года. Так, у студзені ў банках насельніцтвам было куплена 118 кг золата ў злітках, што амаль утрая больш, чым было прададзена за першы месяц 2010 года. А за студзень-люты аб'ём іх продажу склаў больш за 208 кілаграмаў, што амаль у 2,3 раза перавышае паказчык леташніх студзеня-лютага.

Як зазначыў у гутарцы з карэспандэнтам нашай газеты намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, актывізацыя попыту насельніцтва на высакародны метал прадказальная, таму што кошт яго ў свеце расце. У прыватнасці, летась золата падаражэла на 30 працэнтаў. І калі курсы сусветных валют не вызначаюцца стабільнасцю, іх цяжка прадказаць, то ў гэтай сітуацыі прыярытэты асобнай часткі грамадзян і схіляюцца ва ўкладанні ў золата. Наогул, за 2 першыя месяцы ў банках было куплена 7149 штук залатых мерных зліткаў. Больш за ўсё набываюць 1- і 10-грамовыя залатыя зліткі, якіх было прададзена адпаведна 1543 і 1800 штук. Знаходзяцца пакупнікі і на «цяжкаатлетаў» — зліткі вагой па 500 грамаў і 1-кілаграмовыя: так, паўкілаграмовых «брусоў» (кошт аднаго такога зліткa цяпер складае 23 705 долараў) за 2 месяцы куплена 6 штук, а кілаграмовых (адзін прадаецца па 47 400 долараў) і таго больш — 14 штук. Наогул жа са жніўня 2001 года ў краіне агульная вага прададзеных залатых зліткаў склала больш за 7 731 кіло.

Ігар ГРЫШЫН.

МАСЛА НА... ЗАРПЛАТУ

Вадзіцель прыбраў да рук частку тавару былога наймальніка, патрабуючы ў апошняга выплаціць запазычанасць па зарплаце

А пакуль бакі «таргаваліся», паводле звестак прэс-афіцэра Партызанскага РУУС Ганны Чыж-Літаш, сметанковае масла, узятае ў «закладнікі», сапсавалася. Пачалося ж усё з таго, што, працуючы на новым месцы вадзіцелем, мінчанін атрымаў заказ з папярэдняй працы — неабходна было перавезці з іншага горада масла. Калі тавар, кошт якога складаў 340 мільёнаў рублёў, быў атрыманы, мужчына ўспомніў, што папярэдні наймальнік не выплаціў яму зарплату ў памеры 6 тысяч долараў ЗША. А таму па прыездзе ў Мінск ён выгрузіў на складзе прадукцыі ўсяго на 26,5 мільёна рублёў, а астатнюю частку пакінуў у сябе ў кошт пагашэння запазычанасці за зарплату. Калі ж яму праз некаторы час патэлефанавалі і запыталіся пра астатнюю прадукцыю, прадпрымальная асоба патлумачыла: маўляў, да таго часу, пакуль яму не вернуць належнае, тавар будзе знаходзіцца ў «закладніках». Аднак калі ў справу ўмяшаліся супрацоўнікі міліцыі, ён паабяцаў тэрмінова вярнуць выкрадзенае. У дачыненні да 43-гадовага вадзіцеля заведзена крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПУЦІН НАЗВАЎ АПЕРАЦЫЮ Ў ЛІВІІ БЕССАРОМНЫМ КРЫЖОВЫМ ПАХОДАМ

Прэм'ер-міністр РФ Уладзімір Пуцін параўнаў ваенную аперацыю Захаду ў Лівіі з крыжовым паходам, заявіўшы, што ніхто не мае права ўмешвацца ва ўнутрыпалітычныя канфлікты звонку.

Пуцін раскрытыкаваў рэзалюцыю Савета Бяспекі ААН па Лівіі, назваўшы яе «непаўнавартаснай і недасканалай». «Яна дазваляе ўсім рабіць усё, любыя дзеянні ў дачыненні суверэннай дзяржавы... Гэта мне нагадвае сярэднявечны заклік да крыжовага паходу, калі хтосьці заклікаў кагосьці ісці ў пэўнае месца і штосьці вызваляць», — заявіў расійскі прэм'ер.

Акрамя таго, ён ахарактарызаваў палітыку ЗША па ўмяшанні ў канфлікты ў іншых краінах як устойлівую тэндэнцыю, у якой няма ні сорому, ні логікі. У сувязі з гэтым прэм'ер РФ успомніў тое, як падчас прэзідэнцтва Біла Клінтана ішла бамбёжка Белграда, а падчас прэзідэнцтва Джорджа Буша-старэйшага і Джорджа Буша-малодшага — Ірака і Афганістана.

Пуцін падкрэсліў, што ўрад РФ не займаецца знешнепалітычнымі пытаннямі, аднак у яго ёсць асабістае меркаванне з нагоды падзей у Лівіі. Паводле яго слоў, ні па адным параметры лівійскі рэжым не падыходзіць пад крытэрыі дэмакратычнай краіны, але гэта «не значыць, што камусьці дазволена ўмешвацца ва ўнутрыпалітычны канфлікт, нават узброены, звонку, абараняючы адзін з бакоў».

УКРАІНА АЦАНІЛА СВАЕ ЗАПАСЫ СЛАНЦАВАГА ГАЗУ Ў 30 ТРЫЛЬЁНАЎ КУБАМЕТРАЎ

Запасы сланцавага газу ва Украіне складаюць не менш за 30 трыльёнаў кубаметраў, але пасля завяршэння работ па ацэнцы рэсурсаў амерыканскімі экспертамі прагнозы могуць падвоіцца. Пра гэта ў інтэрв'ю «Коммерсантъ-Украіна» распавёў міністр экалогіі і прыродных рэсурсаў Украіны Мікалай Злачэўскі.

Украіна, чыя эканоміка больш чым на палову залежыць ад імпарту расійскага газу, неаднаразова заяўляла пра намеры павялічыць уласную здабычу газу, у тым ліку нетрадыцыйнага, а таксама пашырыць імпарт паліва з альтэрнатыўных расійскай крыніц. У лютым урады Украіны і ЗША падпісалі мемарандум пра супрацоўніцтва ў вобласці разведкі сланцавага газу. Украіна сцвярджае, што на яе тэрыторыі знаходзяцца самыя буйныя радовішчы сланцавага газу ў Еўропе.

Цяпер газ са сланцаў ва Украіне не здабываецца, але ўкраінскія кампаніі вядуць здабычу невялікіх аб'ёмаў шахтавага метану, што неабходна для дэгазацыі шахтаў.

З КОЖНЫМ ВЫДАЛЕНЫМ ЗУБАМ ПАГАРШАЕЦЦА ПАМЯЦЬ

Зубы і якасць памяці звязаныя. Такая выснова была зроблена ў рамках міжнароднага праекта па пытаннях старэння чалавека супрацоўнікамі Універсітэта Тромсэ ў Нарвегіі. На іх думку, са стратай зубоў сапраўды пагаршаецца памяць у чалавека.

Прафесар гераданталогіі ўніверсітэта Мод Бергдаль адзначыў, што медыкам вядома, што многія органы звязаныя адзін з адным. Так, любое ўздзеянне на зубы тут жа адлюстроўваецца на тамаграфічным здымку галаўнога мозгу. Самае страшнае — выдаленне зуба».

Навукоўцы з 1988 года назіралі за групай добраахвотнікаў, даследуючы іх кагнітыўныя здольнасці. Аказалася, здольнасці змяншаліся па меры змяншэння колькасці зубоў. Гэтае назіранне падмацоўваюць вынікі даследавання японскіх спецыялістаў. Толькі там эксперты ў якасці мадэляў абралі грызуноў. Такім чынам, мышы з пэўным наборам разцоў хутчэй і лягчэй знаходзілі корм у лабірынце ў параўнанні з суродзічамі, якія страцілі зубы.

У ЕМЕНЕ ГЕНЕРАЛ-МЯЦЕЖНІК АТАЧЫЎ ТАНКАМІ ПРЭЗІДЭНЦКІ ПАЛАЦ

Бранятэхніка еменскага войска выведзена ў панядзелак на вуліцы сталіцы Емена. Танкі і бронетранспарцёры, у прыватнасці, блакіравалі прэзідэнцкі палац у Сані. Гэта адбылося адразу пасля таго, як адзін з еменскіх военачальнікаў, зводны брат і памагатый прэзідэнта генерал Алі Махсэн Салех аль-Ахмар заявіў пра далучэнне да апазіцыі, якая патрабуе адстаўкі кіраўніка дзяржавы Алі Абдалы Салеха.

Аль-Ахмар камандуе войскамі паўночнай ваеннай акругі, а таксама займае пасаду камандзіра 1-й бранятанкавай дывізіі — адной з самых баяздольных частак еменскіх узброеных сіл. Менавіта яе машыны і атачылі прэзідэнцкі палац.

На бок апазіцыі перайшлі дзясяткі вайскоўцаў і супрацоўнікаў сіл бяспекі, паведамляюць арабскія тэлеканалы. На вуліцах сталіцы шмат танкаў і вайскоўцаў, але цяжка вызначыць, на чыім баку яны выступаюць — прэзідэнта ці яго праціўнікаў.

«ЦІХІ ДОН» УПЕРШЫНЮ ВЫДАДУЦЬ БЕЗ ЦЭНЗУРЫ

Раман Міхаіла Шолахава «Ціхі Дон» упершыню будзе выдадзены ў аўтарскім варыянце — гэта значыць, па рукапісе, без рэдактарскай і цэнзурнай праўкі.



Як паведамляе «Вячэрні Харкаў», кнігу падрыхтавала нейкае расійскае выдавецтва, а друкуюць раман ва Украіне. Аднатомнае выданне, якое выходзіць тыражом у тысячу асобнікаў, убачыць святло не пазней за 9 красавіка.

Тэкст да друку рыхтавалі пісьменнік Аляксандр Стручкоў і старэйшая дачка Шолахава. Як паведаміў журналістам прадстаўнік харкаўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў РФ Леанід Мачулін, у новым выданні будуць адноўлены некалькі тысяч шолахаўскіх слоў, а таксама цэлая частка, прысвечаная паўстанню ў станіцы Вешанская.

ДАР'Я ДОМРАЧАВА ВЫЙГРАЛА АПОШНЮЮ ГОНКУ СЕЗОНА

Ведай нашых!

І заваявала Малы хрустальны глобус

Апошні этап Кубка свету па біятлоне скончыўся для беларускіх балельшчыкаў выдатна: лідар нашай зборнай Дар'я Домрачава выйграла гонку з масавым стартам, якая стала завяршальнай у сезоне. Увогуле гэты этап у Холменколене стаў для Дар'і адметным: яна заняла тры прызавыя месцы. Спачатку беларуска ўзяла бронзу ў спрынце, затым серабро ў гонцы праследавання, а зараз золата ў мас-старце.

Дар'я прамахнулася аднойчы на першай стральбе, затым двойчы адстралялася без промахаў. Высокая хуткасць дазволіла ёй увесь час трымацца ў ліку лідараў. А вось на чацвёртай стральбе Дар'я двойчы прамахнулася. І пакідала стрэльбішча пасля расіянкі Ганны Багалій-Цітавец, у кампаніі яшчэ адной расійскай біятланісткі Вольгі Зайцавай. Але хуткасці ў гэтай гонцы Дар'і было не займаць. Яна пакінула за спінай і Зайцаву, а пасля абагнала і Багалій-Цітавец.

— Калі пасля чацвёртай стральбы пакідала стадыён пасля Багалій-Цітавец, то разумела, што гэта мой апошні шанц. Я не пераставала верыць, што змагу сёння перамагчы. Пасля трох добрых агнявых рубяжоў у мяне было два промахі. Напэўна, мне проста не падабаюцца звычайныя спаборніцтвы, — сказала Даша пасля гонкі.

На фінішы беларуска выйграла ў Багалій-Цітавец 16 секунд, у Зайцавай — 25. З часам 36 хвілін 13 секунд Дар'я Домрачава святкавала перамогу.

Разам з ёй беларусы дастаўся «Малы хрустальны глобус» па выніках гонак з масавым стартам. У агульным заліку Кубка свету Домрачава заняла шостае месца. На чэмпіянаце свету Дар'я стала сярэбраным прызёрам.

Алена АЎЧЫННІКАВА.



Ну і ну!

ЛЮСТЭРКА — ПРЫЧЫНА ПАЖАРУ!

У Віцебску ў новым «спальным» мікрараёне Білева ў шматпавярховым доме адбыўся па-свойму ўнікальны пажар, прычынай якога стала... настольнае люстэрка. Такога здарэння нават вопытныя пажарныя не прыгадваюць.

— Пажарных выклікала гаспадыня кватэры, якая вярнулася з работы вечарам. Яе і мужа ўвесь дзень у кватэры не было. Згарэлі ў ёй плед і бялізна на ложку, сцены пачарнелі ад дыму. Пачалі шукаць крыніцу пажару. Ніводзін з электрапрыбораў, як устанавілі спецыялісты, не быў уключаны — расказвае «Звяздзе» **Аляксандр ДАВІДОВІЧ, старшы інспектар групы прапаганды і навучання Віцебскага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях**. — Звярнулі ўвагу на люстэрка на трумо ля акна. Люстэрка гэтае не зусім звычайнай формы — выпуклай, як лінза. Яно насамрэч магло факусіраваць сонечны прамень на тое, што было на ложку. Ад сонечных прамянёў, якія праходзілі праз люстэрка, і пачалося тленне... Маштабнага пажару ў кватэры не адбылося, бо ўсе вокны і фортачкі былі зачынены.

Потым праводзілі эксперымент з гэтым люстэркам. Апошняе ставілі так, каб пад вуглом на яго трапілі прамяні сонца. І ўжо праз нейкі час пачыналася тленне пад матэрыяй, якую клалі недалёка ад яго. Пра краіну-вытворцу люстэрка сказаць нешта цяжка, бо люстэрка таксама «пачарнела» падчас тлення.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.03.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
1 долар ЗША	3 020,00	1 чэшская крона	175,15	USD	28,3675
1 еўра	4 276,62	1 польскі злоты	1 055,43	10 UAH	35,6600
1 латвійскі лат	6 053,92	1 расійскі рубель	106,46	1000 BYR	9,3901
1 літоўскі літ	1 237,68	1 украінская грыўня	379,66	EUR	40,1996

Агенцтва Уладзіміра Грачова

Вярхоўнаму камісару ААН па правах чалавека **пані Наванетхем ПІЛЭЙ**,
Прадстаўніку АБСЕ па свабодзе СМІ **пані Дуні МІЯТАВІЧ**,
Спецыяльнаму дакладчыку Савета ААН па правах чалавека

ЗВАРОТ
ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ «БЕЛАРУСКІ САЮЗ ЖУРНАЛІСТАЎ»

Сітуацыя, з якой сутыкнуліся беларускія журналісты, беспрэцэдэнтная для сучаснага свету. 31 студзеня 2011 г. 12 прадстаўнікоў СМІ былі ўключаны Саветам Еўрапейскага саюза ў спіс асоб, якім забаронены ўезд на тэрыторыю дзяржаў — удзельніц ЕС.

Гэтыя дзеянні супярэчаць «Еўрапейскай хартыі свабоды прэсы», прынятай у Гамбургу 25 мая 2009 г. Пункт 3 Хартыі гаворыць: «Права журналістаў на збор і распаўсюджванне інфармацыі і меркаванняў не павінна ставіцца пад пагрозу, абмяжоўвацца або з'яўляцца прычынай для санкцый». Гэта значыць, прынятае кіраўніцтвам ЕС рашэнне супярэчыць дакументам, якія ў свой час былі ім жа адобраны.

Можна з упэўненасцю заявіць, што беларускія журналісты падвергнуліся санкцыям з боку ЕС выключна з прычыны таго, што адстойвалі свой пункт гледжання напярэдадні, у час і пасля завяршэння кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. І гэты пункт гледжання прыйшоўся не даспадобы палітычнаму кіраўніцтву краін ЕС. Такім чынам, санкцыі Савета ЕС уяўляюць сабой пакаранне беларускіх журналістаў за свабоднае выказванне імі свайго меркавання. А гэта прамое парушэнне артыкула 10 Канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод ад 4 лістапада 1950 г. (з дадатковымі пратаколамі), артыкула 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах ад 16 снежня 1966 г., а таксама артыкула 11 Хартыі фундаментальных правоў Еўрапейскага саюза.

Рашэнне Савета ЕС было прынята да апублікавання справаздачы АБСЕ аб выбарах у Рэспубліцы Беларусь, што таксама ставіць пад сур'ёзныя сумненні яго абгрунтаванасць. Тым больш, што беларускія журналісты не прымалі ўдзелу ў арганізацыі выбараў, гэтак жа як і ў падзеях, што мелі месца пасля выбараў, абазначаных Саветам ЕС у якасці падставы для ўвядзення санкцый. Відавочна, што ў гэтым выпадку ў наяўнасці праследаванне ў пазасудовым парадку за дзеянні, якіх журналісты не ўчынялі і не маглі ўчыніць.

Акрамя таго, парушана права беларускіх журналістаў на свабоду перамяшчэння, якое замацавана ў артыкуле 2 згаданай Канвенцыі. Такім чынам, у разглядаемай сітуацыі мае месца факт дыскрымінацыі беларускіх журналістаў па прымеце палітычных або іншых перакананняў.

На наш погляд, размова ідзе аб непрыкрытым націску на беларускія мас-медыя з мэтай прымусіць іх да змянення рэдакцыйнай палітыкі і поглядаў асобных журналістаў. Санкцыі ЕС не толькі накіраваны супраць тых супрацоўнікаў СМІ, якія ўключаны ў «чорны спіс», але і даюць выразны і недвухсэнсоўны сігнал іншым журналістам аб тым, якая жорсткая рэакцыя можа быць у выпадку, калі інфармацыя і меркаванні, што яны распаўсюджваюць, будуць супярэчыць пазіцыі кіраўніцтва Еўрасаюза.

Лічым, што ўвядзенне такіх санкцый уяўляе сабой небяспечны прэцэдэнт для ўсёй журналісцкай супольнасці.

Просім аказаць садзейнічанне ў аднаўленні правоў беларускіх журналістаў.

Прынята на Сакратарыяце ГА «Беларускі саюз журналістаў»
г. Мінск 19 сакавіка 2011 г.

ДВУХБАКОВЫЯ АДНОСІНЫ БЕЛАРУСІ І ІРАНА БУДУЦЬ І Ў ДАЛЕЙШЫМ АКТЫЎНА ПАШЫРАЦЦА

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран Махмуда Ахмадзінежада і ўвесь іранскі народ з Новым, 1390-м, годам. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Перакананы, што агульнымі намаганнямі двухбаковыя адносіны Беларусі і Ірана будуць і ў далейшым актыўна пашырацца дзеля працвітання нашых дружалюбных краін», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мітрапаліта Філарэта з днём нараджэння

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, з днём нараджэння. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Многія гады Вы нястомна служыце на ніве сцвярджэння хрысціянскіх каштоўнасцяў і духоўнасці. Пры Вашым асабістым удзеле ідзе аднаўленне старадаўніх святынь Беларусі, якія складаюць неад'емную частку гісторыі і культуры нашага народа. Менавіта дзякуючы Вашай плённай дзейнасці Беларуская праваслаўная царква па праве разглядаецца сёння як актыўны партнёр дзяржавы ў вырашэнні вострых пытанняў сучаснасці», — гаворыцца ў віншаванні.

«Ваш аўтарытэт у грамадстве надзвычай высокі. Вы акружаны любоўю і пашанай не толькі вернікаў, але і ўсіх беларускіх грамадзян, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Няхай і ў далейшым Ваш шчыры клопат і малітоўны ўдзел будуць нам апорай у жыццёвых намаганнях і пачынаннях».

Кіраўнік дзяржавы пажадаў Мітрапаліту Філарэту моцнага здароўя, даўгалецця, дапамогі Божай у служэнні Царкве і народу Беларусі.

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ:

«БЕЛАРУСЬ У 2011 ГОДЗЕ БУДЗЕ АКТЫЎНА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ПРАГРАМАХ ГУМАНІТАРНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА СНД»

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў міністр інфармацыі Беларусі, сустаршыня Савета па гуманітарным супрацоўніцтве СНД Алег Праляскоўскі па выніках пасяджэнняў экспертаў і кіраўнікоў Савета гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД і Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва СНД, якія прайшлі ў Душанбэ.

«Беларусь традыцыйна займае актыўную пазіцыю ва ўсіх інтэграцыйных структурах. Гэта пазіцыя нашага Прэзідэнта. Структуры гуманітарнага супрацоўніцтва СНД не выключэнне», — сказаў Алег Праляскоўскі. Міністр адзначыў, што міжнародным прызнаннем укладу Беларусі ў захаванне гісторыка-культурнай спадчыны можна лічыць наданне ў 2011 годзе звання «Культурная сталіца СНД» Гомелю. Дарэчы, праект пілотны.

Фонд зацвердзіў шэраг знакавых мерапрыемстваў, якія будуць праведзены ў Беларусі. Традыцыйнымі стануць Беларускі інфармацыйны форум «Партнёрства ў імя міру», Міжнародная летняя школа маладых журналістаў краін СНД, Моладзевая музычная акадэмія краін СНД Юрыя Башмета. У Беларусі таксама пройдуць міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «20 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў», міжнародны моладзевы форум «Дружба без граніц», моладзевы форум опернага мастацтва краін СНД, конкурс маладых архітэктараў СНД «Леанарда».

У 2010 годзе фонд на тэрыторыі Беларусі аказаў падтрымку ў правядзенні 14 мерапрыемстваў, выдаткаваўшы на гэта больш як 35 млн расійскіх рублёў.

Аляксандр Лукашэнка мае намер прыняць удзел у мерапрыемствах у Кіеве, прымеркаваных да ўгодкаў чарнобыльскай катастрофы

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка мае намер прыняць удзел у мерапрыемствах, прымеркаваных да 25-й гадавіны чарнобыльскай катастрофы, якія пройдуць у красавіку ў Кіеве, паведамляе агенцтва «Інтэрфакс-Захад» са спасылкай на Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ва Украіне Валянціна Вялічку. «Беларускі бок будзе прадстаўлены на красавіцкіх мерапрыемствах у Кіеве, прымеркаваных да 25-годдзя аварыі на Чарнобыльскай АЭС, на самым высокім узроўні», — адзначыў беларускі дыпламат, каментуючы заяву кіраўніка адміністрацыі ўкраінскага прэзідэнта Сяргея Лёвачкіна аб тым, што Беларусь на міжнароднай канферэнцыі ў Кіеве будзе прадстаўляць прэм'ер-міністр. «У нас ёсць афіцыйнае запрашэнне ўкраінскага боку на імя нашага прэзідэнта, і Аляксандр Лукашэнка мае намер асабіста прыняць удзел у гэтых мерапрыемствах», — сказаў Валянцін Вялічка.

Міністэрства замежных спраў Беларусі выступіла з заявай у сувязі з ракетна-бомбавымі ўдарамі па Лівіі

Міністэрства замежных спраў Беларусі выступіла з заявай у сувязі з ракетна-бомбавымі ўдарамі па Лівіі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе МЗС.

«Ракетна-бомбавыя ўдары па тэрыторыі Лівіі выходзяць за рамкі рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН № 1973 і супярэчаць яе галоўнай мэце — забеспячэнню бяспекі мірнага насельніцтва. Рэспубліка Беларусь заклікае дзяржавы, якія прымаюць удзел у ваеннай аперацыі, неадкладна спыніць баявыя дзеянні, што прыводзяць да чалавечых ахвяр. Урэгуляванне канфлікту з'яўляецца ўнутранай справай Лівіі і павінна быць забяспечана самім лівійскім народам без ваеннага ўмяшання збоку», — гаворыцца ў заяве.

Беларусь забараняе ўезд больш як 150 прадстаўнікам ЕС і ЗША, сярод якіх кіраўнік Еўрапарламента Е. Бузек

Беларусь падрыхтавала і ўжо рэалізуе меры ў адказ на рашэнне ЕС аб санкцыях адносна беларускіх чыноўнікаў, якія закрануць больш як 150 асоб з Еўрапейскага саюза і ЗША, паведамляе агенцтва «Інтэрфакс-Захад».

«Меры ў адказ закрануць больш як 150 асоб з краін Еўрасаюза і ЗША, сярод якіх старшыня Еўрапарламента Ежы Бузек, дэпутат Еўрапарламента Яцак Пратасевіч і шэраг іншых палітыкаў, парламентарыяў, журналістаў, якія праславіліся найбольш адыёзнымі ініцыятывамі адносна Беларусі», — адзначылі ў агенцтве.

Ужо ўведзены абмежаванні на выдачу ўязных віз шэрагу асоб, якія найбольш прадузята і дэструктыўна ставяцца да Рэспублікі Беларусь і адыгралі галоўную ролю ў раскручванні крызісу ў адносінах Беларусі і Захаду.

Аднымі візавымі санкцыямі Беларусь не мае намеру абмяжоўвацца і распрацавала шэраг іншых мер у адказ. «Не выключана, што яны закрануць пытанні трансгранічнага супрацоўніцтва, дзейнасці на тэрыторыі Беларусі асобных замежных фондаў і няўрадавых арганізацый», — сказалі ў агенцтве. Пры гэтым прынятыя меры будуць мець, хутчэй, прапарцыянальны і дыферэнцаваны характар адносна санкцый ЕС і ЗША.

Як паведамлялася, 31 студзеня Савет ЕС увёў візавыя санкцыі адносна 157 беларускіх чыноўнікаў на чале з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам.

Абзац

◢ Тры фарэлевыя комплексы агульнай магутнасцю 600 т у год плануецца пабудаваць у Мінскай вобласці ў бліжэйшыя гады. Комплексы размесцяцца на базе рыбгасаў «Грыцава» Маладзечанскага, «Волма» Чэрвеньскага і «Альба» Стаўбцоўскага раёнаў. Прапрацоўваецца пытанне па зарыбленні сёлета рыбалоўных угоддзяў Мядзельскага раёна малькамі вугра.

◢ **Адразу 5 машын сталі ўдзельнікамі ДТЗ у Брэсце. Аварыя адбылася ў нядзелю каля 21.00 на скрыжаванні вуліц 28 чэрвеня і Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аўтамабіль «Пежо» пад кіраваннем 50-гадовага жыхара Брэста пратараніў «Фальксваген Пасат», які спыніўся на чырвонае святло. Пашкоджанні атрымалі таксама «Рэно» і два «Мерседэсы», якія стаялі на святлафоры. Траўмы атрымаў толькі кіроўца «Пежо» — у яго зламаны нос. Вядзецца праверка.**

Поўны абзац

◢ Чалавек з самым доўгім прозвішчам жыве ў Германіі. Яно складаецца з 24 літар — Бернд Оттавордэмгентшэнфельдэ (Bernd Ottovordemgentschenfelde). Пасля гэтага нават Б'ёрк Гудмундсдатыр здаецца лёгкім варыянтам. Як прызнаецца Бернд, ён нярэдка сутыкаецца з праблемамі, калі ўзнікае неабходнасць упісаць імя ў афіцыйны бланк.

◢ **У Сямеі (былым Сяміпалацінску) 8-гадовае дзіця заліло варэннем падлогу і накідала на яе кансерваванай агародніны. Такім чынам хлопчык вырашыў адпомсціць бацькам, якія пазбавілі яго камп'ютарных гульняў. Ад камп'ютара юны геймер быў адлучаны ў выхаваўчых мэтах. Разлавіўшыся на бацькоў, хлопчык залез у кладоўку, дзе ляжалі «закаткі», і стаў «упрыгожваць» імі падлогу. Усяго, як падлічыла маці геймера, ён адкрыў 11 літровых слоікаў з варэннем, 5 трохлітровых з агуркамі і памідорамі, яшчэ 3 — з кампотам і 7 — з салатамі. Калі бацькі прыйшлі дадому, у кватэры быў пагром, а дзіця сядзела ў шафе. Яно сцвярджала, што да вэрхалу ў кватэры не мае дачынення.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

КАБ БЯРОЗАВІК НЕ БЫЎ «ГОРКІМ»

Не забараняецца пры выкананні пэўных умоў грамадзянам самастойна нарыхтоўваць бярозавік для ўласных патрэб. Для гэтага трэба толькі звярнуцца ў лясніцтва. Нарыхтоўка на прыродных тэрыторыях, якія асабліва ахоўваюцца, можа «каштаваць» грамадзяніну штрафу ў памеры ад 4 да 35 базавых велічынь (140—1225 тысяч рублёў), індывідуальнаму прадпрымальніку — да 100 базавых (3,5 мільёна рублёў), юрыдычнай асобе — да 500 базавых велічынь (17,5 мільёна рублёў). Парушэнне тэхналогіі нарыхтоўкі і нарыхтоўка на ўчастках, дзе яна не дазволена, расцэньваецца як незаконнае знішчэнне ці пашкоджанне дрэў і цягне накладанне штрафу на грамадзяніна ў памеры ад 5 да 50 базавых велічынь (175—1750 тысяч рублёў), на індывідуальнага прадпрымальніка — ад 20 да 200 базавых (700—7000 тысяч), на юрыдычную асобу — ад 50 да 300 базавых велічынь (1750—10500 тысяч рублёў) — для лясоў першай групы і тых, якія не ўваходзяць у лясны фонд; і штрафу на грамадзяніна ў памеры да 30 базавых велічынь (1050 тысяч), на індывідуальнага прадпрымальніка — ад 10 да 150 базавых (350—5250 тысяч рублёў), на юрыдычную асобу — ад 50 да 300 базавых велічынь (1750—10500 тысяч рублёў) — у астатніх лясах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Члены Інфармсавета СНД выказалі заклапочанасць прымяненнем санкцый да беларускіх журналістаў

На XIII пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаўных інфармацыйных агенцтваў СНД, якое праходзіць у Душанбэ, разгледжана пытанне аб візавых санкцыях Еўрасаюза да беларускіх журналістаў. Члены Інфармсавета СНД выказалі заклапочанасць прымяненнем санкцый да беларускіх журналістаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Прынята рашэнне ўзняць пытанне аб санкцыях на вясенняй канферэнцыі Еўрапейскага альянсу інфармацыйных агенцтваў і данесці пазіцыі Інфармсавета СНД, якія асуджаюць прымяненне такіх мер да журналістаў.

У Еўрапейскі альянс інфармацыйных агенцтваў уваходзяць АзерТАдж, ІТАР-ТАСС.

Вясенняя канферэнцыя Еўрапейскага альянсу інфармацыйных агенцтваў будзе праходзіць 18—21 мая ў Берліне.

Асуджаны за распаўсюджанне «пірацкіх» дыскаў

47 DVD-дыскаў са скапіраванымі аўдыявізуальнымі творамі канфіскавалі ў індывідуальнага прадпрымальніка з Барысава.

Паводле слоў старшага памочніка пракурора Мінскай вобласці Таццяны КАЛІНІНАЙ, барысаўчанін да гэтага ўжо аднойчы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за незаконнае распаўсюджанне аб'ектаў аўтарскага права. Аднак гэта яго не спыніла. Пасля накладання штрафу ён зноў узяўся за старое: без згоды праваўладальнікаў прадаваў на сваім гандлёвым аб'екце дыскі з аўдыявізуальнымі творамі.

Прыгаворам суда спадар Б. асуджаны па ч. 2 артыкула 201 Крымінальнага кодэкса (парушэнне аўтарскіх, сумежных, вынаходніцкіх і патэнтных правоў) да штрафу ў даход дзяржавы ў памеры 110 базавых велічынь (1 б. в. — 35 тысяч рублёў). Акрамя таго, з яго спагнана кампенсацыя шкоды на карысць чатырох праваўладальнікаў на суму 16 800 000 рублёў. Прысуд барысаўчанін не абскардзіў.

Надзея ДРЫЛА.

УНП 600122771.

Открытое акционерное общество «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции»

Адрес: г. Солигорск Минской обл., ул. Козлова, 37, тел./факс 8 0174 229946

Основной вид деятельности: общестроительные работы

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2011 года

в млн рублей

№ строки	АКТИВ	На начало года	На конец года	№ строки	ПАССИВ	На начало года	На конец года
190	Внеоборотные активы	124265	163215	410	Уставный фонд	48	48
210	Запасы и затраты	68966	71500	420	Резервный фонд	3547	4340
220	Налоги по приобретенным ценностям	3660	6791	430	Добавочный фонд	124479	161896
				450	Нераспределенная прибыль	0	0
230	Дебиторская задолженность	0	0	460	Целевое финансирование	291	135
240	Дебиторская задолженность	45467	81069	470	Доходы будущих периодов	4784	363
250	Расчеты с учредителями	0	0	490	Итого капитал и резервы	138149	166782
260	Денежные средства	49688	35526	510	Долгосрочные кредиты и займы	30902	37598
270	Финансовые вложения	99	149				
280	Прочие оборотные активы	154	203	520	Прочие долгосрочные обязательства	1088	4583
290	Итого оборотные активы	168034	195238				
300	**БАЛАНС**	**292299**	**358453**	590	Итого долгосрочных обязательств	31990	42181
				610	Краткосрочные кредиты и займы	16902	22707
				620	Кредиторская задолженность	104194	125408
				630	Задолженность перед учредителями	1064	1375
				650	Резервы предстоящих расходов	0	0
				690	Итого краткосрочные обязательства	122160	149490
				700	**БАЛАНС**	**292299**	**358453**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2010 год

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный период
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	020	663537
В том числе: бюджетные субсидии на покрытие разницы в ценах	021	677
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг и расходы на реализацию	030-060	626976
Прибыль от реализации	070	36561
Прибыль от операционных доходов и расходов	120	4860
Убыток от внереализационных доходов и расходов	160	-9855
Итого прибыль за отчетный период	200	31566
Налог на прибыль	250	9866
Прочие налоги и сборы, производимые из прибыли	260	1694
Расходы и платежи из прибыли	270	290
Чистая прибыль (убыток)	300	19696
Справочно: сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310	2650

1. Количество акционеров – всего **2481**, в том числе юридических лиц – **8**, физических лиц – **2473**.

2. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	1375	1064
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	3976,5	3077,4
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	318,6	256,3
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	Нет	Нет

Руководитель Н.З. Ашейчик **Главный бухгалтер А.М. Шадурко**

Организация: **ОАО «ЦентроСтройОфис»**
Учетный номер плательщика: **УНП 191303207**
Вид деятельности: **Операции с недвижимым имуществом**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220019, г. Минск, ул. Монтажников, 39, офис 208**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101		1 168
амортизация	102		614
остаточная стоимость	110		554
ИТОГО по разделу I	190		554
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210		7
В том числе:			
сырье, материалы и другие аналогичные активы	211		7
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240		30
В том числе:			
покупателей и заказчиков	241		30
поставщиков и подрядчиков	242		
Денежные средства	260		28
Финансовые вложения	270		
ИТОГО по разделу II	**290**		**65**
БАЛАНС (190+290)	**300**		**619**
ПАССИВ	**Код строки**	**На начало года**	**На конец отчетного периода**
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	-	459
Добавочный фонд	430	-	53
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	-	67
ИТОГО по разделу III	**490**	**-**	**579**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Кредиторская задолженность	620	-	40
в том числе:			
перед поставщиками и подрядчиками	621	-	6
перед покупателями и заказчиками	622	-	1
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	-	17
по налогам и сборам	625	-	10
по социальному страхованию и обеспечению	626	-	1
перед прочими кредиторами	628	-	5
ИТОГО по разделу V	**690**	**-**	**40**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**-**	**619**
Из строки 620:			
краткосрочная кредиторская задолженность	702	-	40
Активы и обязательства, учитываемые за балансом	**Код строки**	**На начало года**	**На конец отчетного периода**
1	2	3	4
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	-	5

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ период с 1 января по 31 декабря 2010 г.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период предыдущего года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	197	-
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	16	-
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	181	-
Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидии) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021	0	-
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	159	-
Валовая прибыль (020-021-030)	040	22	-
Управленческие расходы	050	0	-
Расходы на реализацию	060	0	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	22	-
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	120		-
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	62	-
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131		-
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	62	-
Внереализационные расходы	150	17	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	45	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (-/+070-/+120-/+160)	200	67	-
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	1	-
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220		-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (-/+200+210-220)	240	68	-
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	300	67	-

РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период предыдущего года	
наименование	код	доход	расход	доход	расход
1	2	3	4	5	6
Прочие доходы и расходы	400	62	17		
ИТОГО	500	62	17		

Руководитель Ребенок Т.Н. Гл. бухгалтер Кунец Н.Б.
18 марта 2011 г.

Организация: **ОАО «ЭнКоСтрой»**
Учетный номер плательщика: **УНП 191303197**
Вид деятельности: **Операции с недвижимым имуществом**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220019, г. Минск, ул. Монтажников, 39, офис 201**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101		6 141
амортизация	102		3 261
остаточная стоимость	110		2 880
ИТОГО по разделу I	**190**		**2 880**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210		3
В том числе:			
сырье, материалы и другие аналогичные активы	211		3
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240		128
В том числе:			
покупателей и заказчиков	241		102
поставщиков и подрядчиков	242		26
Денежные средства	260		17
Финансовые вложения	270		1 100
ИТОГО по разделу II	**290**		**1 248**
БАЛАНС (190+290)	**300**		**4 128**
ПАССИВ	**Код строки**	**На начало года**	**На конец отчетного периода**
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	-	2 908
Добавочный фонд	430	-	299
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	-	775
ИТОГО по разделу III	**490**	**-**	**3 982**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
ИТОГО по разделу IV	590	-	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Кредиторская задолженность	620	-	146
в том числе:			
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	-	26
по налогам и сборам	625	-	115
по социальному страхованию и обеспечению	626	-	5
ИТОГО по разделу V	**690**	**-**	**146**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**-**	**4 128**
Из строки 620:			
краткосрочная кредиторская задолженность	702	-	146
Активы и обязательства, учитываемые за балансом	**Код строки**	**На начало года**	**На конец отчетного периода**
1	2	3	4
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	-	58

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ период с 1 января по 31 декабря 2010 г.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период предыдущего года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	391	-
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	31	-
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	360	-
Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидии) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021	0	-
16.50 Дэтэктыў «Агарова, 6».
18.35 «Смяяцца дазваляецца».
20.00 Весткі тыдня.
21.05 «Танцы з Зоркамі».
0.35 «Спецыяльны карэспандэнт».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

7.30 М/ф «Боцман і папугай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.20 «У зоне асаблівай рызыкі».
8.45 «Іх норавы».
9.20 «Ядзім дома!».
10.20 «Першая перадача».
10.55 «Банкет на ўвесь свет».
11.55 «Дачны адказ».
13.20 «Таямнічая Расія»: Чалябінская вобласць. «Госці» з падзямелля?».
14.10 «Апошняе слова». Токшоу.
15.15 «Сеанс з Кашпіроўскім. Бяссмерце».
16.20 «Гісторыя ўсерасійскага падману. Выхад ёсць!».
17.20 «І зноў прывітанне!».
18.25 «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
19.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.55 «Цэнтральнае тэлебачанне».
22.10 Серыял «Глухар».
1.00 «Увага: вышук!».
1.35 «Футбольная ноч».

ТНТ

5.00 М/с «Мішн Хіл».
6.00 М/с «Як кажа Джындджэр».
6.55 М/с «Бейблэйд: Гарачы метал».
7.15, 8.00 «Сябры». Серыял.
7.55 «Лато Спорт Супер».
8.50 Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка ўдачы».
9.00, 2.55 «Школа рамонту».
10.00 «Экстрасэнсы вядуць расследаванне».
11.00 «А вам слабо?». Дак. фільм.
12.00 «Хор». Серыял.
13.45 «Інтэрны». Сітком.
15.15 «Гары Потэр і кубак агню». Фэнтэзі.
18.30 Серыял «Шчаслівыя разам».
19.00 «Наша Russia».
19.30 «Вікінгі супраць прышэльцаў». Камедыя.
22.00, 1.55 «Дом-2».
23.30 «Прапашчыя хлопцы». Трылер.
1.25 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
3.55 «Cosmopolitan». Відэаверсія».

ІНТЭР+

7.30 Самы разумны.
9.15, 9.55, 11.00 Нядзеля з «Кварталам».
9.30 Школа доктара Камароўскага.
10.00 Ранішняя пошта.
10.30, 0.50 Папялушка для Баскава.
11.05 Смачная ліга.
11.50, 1.20 Арол і Рэшка.
12.40, 0.20 Тыдзень моды.
13.05 Разбор палётаў.
13.50 Маст. фільм «Пісьмы мёртвага чалавека».
15.15 Вячэрні квартал.
15.55 Канцэрт Вітаса «Бяссонная ноч».
17.50 Утоеная рэальнасць.
18.30, 3.45 Маст. фільм «Сіцыліянская абарона».
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
20.45, 2.05 «Што? Дзе? Калі? Зорныя войны».
21.45, 5.10 Д/п «Брама часу».
22.30 Дзве конскія сілы.
22.55 Гульні патрыётаў.
0.15 Музыка з Украіны.
5.55 Скептык.

КУЛЬТУРА

5.30 «Ёўраньюс».
9.00, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.10 «І жывуць жа людзі!».
9.40 «Сяброўкі».
10.10 «Пакуль не згуляў у скрыню». Драма.
11.40 Казкі з аркестрам. Х. К. Андэрсэн. «Снежная каралева».
12.35, 0.55 «З глыбіні мора». Дак. фільм.
13.30 «Што рабіць?».
14.15 «Павел Паповіч. Касмічны хуліган».
14.45 Балет «Дама з камеліямі».
17.10 «Поспех». Маст. фільм.
18.40 Спектакль «Звычайная гісторыя». Запіс 1970 года.
21.00 «Кантэкст».
21.40 «Геній дзюдо». Маст. фільм.
0.35 «Казкі старога піяніна». «Патоп». М/ф для дарослых.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Юрый Гагарын». Дак. фільм. 1969 год.
5.55 «Залаты шлягер». 1994 год.
6.40 «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк».
7.05 «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм. 1980 год.
8.00, 14.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00 «Колба часу».
10.05 «Кінапанарама». 1989 год.
11.00 «Да і пасля...». Год 1980.
12.15 «Не смешна. Перад люстэркам». 1980 год.
12.40 «Што? Дзе? Калі?». Фінальная гульня 1980 года.
15.00 «Жонка сышла». Маст. фільм.
16.30 «Маскоўскія матывы». Фільм-канцэрт. 1981 год.
17.00 «Акулы пяра».
18.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
19.05 «Вакол смеху». 1984 год.
20.00 «Быў час».
21.00 «Начны хіт». 1993 год.
21.55 «Шынок 13 крэслаў». 1970 год.
23.00 «Канцэрт да дня работнікаў гандлю». 1984 год.
23.50 «І жартам, і ўсур'ёз». 1988 год.
0.30 «Пераход на летні час». Тэлеспектакль. 1986 год.
4.05 «Погляд» ад 24 сакавіка 1995 года.

MTV

5.00, 23.35 Music.
6.00 Стэрэа_раніца. The Best.
8.45 «Губка Боб».
10.00 News блок Weekly.
10.30 Ікона відэагульняў.
11.00 Зоркі на далоні.
11.30, 23.05 Трэндзі.
**12

ГАДЗІНА ПРАЦЫ БЕЛАРУСКІХ МЕДЫКАЎ «КАШТУЕ» МЕНШ ЯК ДВА ДОЛАРЫ...

...а па колькасці адпрацаваных гадзін медработнікаў апярэджваюць толькі работнікі сельскай гаспадаркі

Колькі гадоў таму працу ўрача на з'ездзе тэрапеўтаў вельмі трапна параўналі з працай аратага. Маўляў, для таго, каб атрымаць больш-менш годныя грошы, медыцынскія работнікі павінны «араць, араць і араць». З трыбуны з'езда была агучана адна цікавая лічба: у пачатку XX стагоддзя мінскія ўрачы зараблялі 2400 рублёў у год і па аплаце працы займалі трэцяе месца пасля гарадскога галавы і кіраўніка прадстаўніцтва Санкт-Пецярбургскага банка.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сёння ж у Беларусі, у адрозненне ад многіх еўрапейскіх краін, дзе прафесія ўрача — адна з самых высокаплатных, медыцынская галіна займае па выніках 2010 года 10-е рангавае месца па ўзроўні сярэднямесячнай заработнай платы і 11-е месца — па ўзроўні аплаты за гадзіну працы. Калі быць больш дакладнымі, то **адна гадзіна працы медыцынскага работніка «каштуе» 5527 беларускіх рублёў. Для параўнання: у гандлі і грамадскім харчаванні сярэдні «кошт» гадзіны працы складае 6604 рублі, жыллёва-камунальнай гаспадарцы — 6853 рублі, прамысловасці — 8864 рублі, апараце органаў дзяржаўнага кіравання — 9925 рублёў, будаўнічай галіне — 10 171 рубель, а ў банкаўскіх арганізацыях — 14 193 рублі за гадзіну.** Менш за работнікаў медыцынскай галіны зараблянюць толькі ў сельскай гаспадарцы, сферы сацыяльнага забеспячэння і культуры, але гэтае адставанне зусім нязначнае.

Затое па сярэдняй колькасці адпрацаваных гадзін беларускія медыкі саступаюць толькі работнікам сельскай гаспадаркі: летась у сярэднім адным работнікам аховы здароўя было адпрацавана 2112 гадзін, што на 14 працэнтаў больш, чым у прамысловасці. І гэта пры тым, што па выніках атэстацыі працоўных месцаў у шкодных і (ці) небяспечных умовах працы шчыруюць каля 65 працэнтаў работнікаў медыцынскай галіны (а ўвогуле па народнай гаспадарцы — 33,3 працэнта). У сельскай гаспадарцы на кожнага работніка прыйшлося за год у сярэднім **2169 адпрацаваных гадзін**. Гэтыя лічбы агучыў на выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя **старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аховы здароўя Роберт ЧАСНОЙЦЬ**.

— Дзякуючы павелічэнню выпуску з медыцынскіх ВНУ ў апошнія гады намецілася станоўчая дынаміка паказчыкаў укамплектаванасці ўрачэбным персаналам, — паведаміў ён. — Аднак каэфіцыент сумяшчальніцтва па-ранейшаму застаецца высокім — 1,40. Пры гэтым захоўваецца тэндэнцыя скарачэння колькасці работнікаў з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй.

Варта нагадаць, што ўсяго пяцьшэсць гадоў таму кіраўніцтва Міністэрства аховы здароўя было заклапочана праблемамі з працаўладкаваннем выпускнікоў медыцынскіх сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі. І калі пры размеркаванні выпускнікоў медыцынскіх ВНУ апошнія ішлі літаральна нарасхват, то пры размеркаванні кадраў з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй назіралася зусім іншая карціна: колькасць заявак ад патэнцыяльных наймальнікаў была значна меншая, чым колькасць падрыхтаваных маладых спецыялістаў. У сувязі з перавытворчасцю сярэдняга медперсаналу нават давялося даволі істотна скарачаць кантрольныя лічбы набору. А ва ўстановы аховы здароўя з міністэрства быў накіраваны ліст, дзе кіраўнікам нагадвалі пра неабходнасць рэалізацыі канстытуцыйнага права моладзі на працу і забеспячэнне гарантыі прадастаўлення першага працоўнага месца. За стварэнне штучнага дэфіцыту працоўных месцаў кіраўнікі маглі пазбавіцца сваёй пасады. Але ўсяго праз некалькі гадоў сітуацыя змянілася з дакладнасцю наадварот. У 2009 годзе медыцынскія навучальныя ўстановы змаглі задаволіць толькі 50 працэнтаў ад патрэбы галіны ў кадрах з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй і 70 працэнтаў — у 2010 годзе. Пры гэтым, як гэта ні парадаксальна, найбольшая патрэба ў медыцынскіх сёстрах назіраецца ў Мінску і ва ўстановах аховы здароўя рэспубліканскага падпарадкавання. У сталіцы ў 2010 годзе медустановы былі ўкамплектаваны ўрачамі на 77,8 працэнта, а сярэдніх медперсаналам — на 77 працэнтаў. Найбольш востра праблема дэфіцыту кадраў стаіць для паліклінік, прыёмных аддзяленняў бальніц і мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі.

— За два апошнія гады колькасць сярэдняга медыцынскага персаналу зменшылася на 471 чалавека, а каэфіцыент сумяшчальніцтва ўзрос з 1,17 у 2008 годзе да 1,21 у 2010 годзе. Увогуле на працягу апошніх гадоў у галіне назіраецца значны кадравы дысбаланс у суадносінах паміж урачамі і сярэднім медыцынскім персаналам, узрастаюць нагрузкі на сярэдні медыцынскі персанал, расце яго незадаволенасць, — паведаміў Роберт Часнойць. — У 2010 годзе колькасць медыцынскіх работнікаў, якія звольніліся, скарацілася ў параўнанні з 2009 годам амаль на 14 працэнтаў, аднак па-ранейшаму **больш як 60 працэнтаў тых, хто вырашыў пакінуць галіну, — гэта работнікі ва ўзросце да 40 гадоў. Як вынік, працягвае павялічвацца доля асоб пенсійнага ўзросту, якія працуюць у галіне: сярод урачоў з 17,8 працэнта ў 2008 годзе да 19,9 працэнта летась, а сярод работнікаў з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй — з 9,7 працэнта да 10,7 працэнта**.

Даведка «Звязды»:

У 2010 годзе сярэдняя заработная плата ўрачоў склала ў Беларусі 1 млн 672 тысячы рублёў або 558 долараў ЗША, у сярэдняга медперсаналу — 951 тысячу рублёў або 318 долараў. Гэта з улікам работы, выкананай звыш устаноўленай працягласці працоўнага часу, начных дзяжурстваў, выканання дадатковага аб'ёма работ і з улікам дэфіцыту кадраў. Каэфіцыент сумяшчальніцтва складае ва ўрачоў 1,40.

Дарэчы, калі ў 34-й цэнтральнай раённай паліклініцы г. Мінска прааналізавалі работу ўчастковай медыцынскай сястры, то высветлілася, што працягласць яе працоўнага дня складае ў сярэднім 9-9,5 гадзіны пры нармаваным працоўным дні ў сярэднім 7 гадзін 30 хвілін. Натуральна, што пастаянныя празмерныя нагрузкі прыводзяць да развіцця ў медработнікаў сіндрому эмацыйнага выгарання, праблем са здароўем і сном, да парушэння правілаў аховы працы і, што вельмі важна, да здзяснення прафесійных памылак, якія могуць уплываць на здароўе пацыентаў.

У сваім выступленні на выніковай калегіі Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама **першы намеснік міністра аховы здароўя Валерый ХАДЖАЕЎ** заклікаў кіраўнікоў сталічнай медыцыны разабрацца з цякучасцю кадраў:

— Чаму ў адной паліклініцы работнікі застаюцца надоўга, а з іншай бягуць? Пацыенты часта падказваюць, што ў медустанове арганізацыя работы не зусім правільная. А гэта залежыць ад кіраўніка і яго бліжэйшых памочнікаў. Амбулаторна-паліклінічнай службе не хапае сур'ёзнага планавання. Шквал наведванняў, неабгрунтаваныя выклікі — галаўны боль не толькі для сталіцы. Ёсць апасенні, што з увядзеннем пасады памочніка ўрача некаторыя ўчастковыя тэрапеўты перастануць займацца медыцынай, бо ім і сёння не ўдаецца адысці ад дыспетчарскіх функцый...

Аб праблеме дэфіцыту персаналу гаварыў і **галоўны пазаштатны дзіцячы кардыяхірург Міністэрства аховы здароўя Юрый ЧАСНОЎ** у сваім выступленні на рэспубліканскай нарадзе па выніках работы кардыялагічнай службы. Ён, у прыватнасці, паведаміў, што з-за дэфіцыту рэанімацыйных сёстраў летась у Беларускім дзіцячым кардыяхірургічным цэнтры зменшылася колькасць хірургічных умяшанняў: «Цяжкасць работы ў рэанімацыі з нованароджанымі адпужвае, у выніку там працуюць адны энтузіясты». У сувязі з недахопам медыцынскага персаналу павялічылася чарга на планавыя кансультацыі і на планавую шпіталізацыю».

Яшчэ адна праблема — рынкі, якім падвяргаецца медыцынскі персанал пры выкананні прафесійных абавязкаў. Паводле інфармацыі галіновага прафсаюза, у 2009 годзе ў выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці пацярпелі 57 чалавек, а таксама 45 чалавек — у 2010 годзе. Колькасць пацярпелых з цяжкім зыходам склала 12 чалавек у 2009 годзе і 3 — летась.

— З агульнай колькасці пацярпелых за два апошнія гады ў 24 выпадках (23,5 працэнта) **траўмы былі атрыманы медыкамі ў выніку проціпраўных дзеянняў пацыентаў**, — паведаміў Роберт Часнойць. — 41 чалавек (40,2 працэнта) атрымаў траўмы ў выніку дарожна-транспартных здарэнняў, прычым па віне вадзіцеляў старонніх арганізацый і ўладальнікаў асабістага транспарту дарожна-транспартныя здарэнні адбыліся амаль у 90 працэнтах выпадкаў. У 30 выпадках (29,4 працэнта ад агульнай колькасці) прычынай атрымання траўмы стала асабістая неасцярожнасць работнікаў. Прафесійныя захворванні ў 2009—2010 гадах былі выяўлены ў 28 работнікаў, з іх 26 чалавек былі інфіцыраваны туберкулёзам. Лічу неабходным неадкладна прыступіць да прапрацоўкі пытанняў страхавання медыцынскіх работнікаў, уключаючы страхаванне ўрачэбнай адказнасці.

Між іншым, ёсць пытанні, знайсці адказ на якія пакуль не ўдаецца. Як павысіць страчаны за апошнія гады прэстыж урача ў грамадстве? З аднаго боку, нярэдка пратаколы лячэння звужаюць яго работу да функцый дыспетчара, а не лячэбніка, а з іншага боку — пацыенты прызвычаіліся да думкі, што дапамогу могуць аказваць толькі кардыёлагі, пульманолагі, неўрапатолагі і г.д. — гэта значыць, толькі «вузкія» спецыялісты. Такім чынам, яны ставяць пад сумненне магчымасці ўрачоў-тэрапеўтаў. Як вызваліць час для стасункаў урача і пацыента? Як зменшыць нагрузку на амбулаторна-паліклінічнае звяно, бо па колькасці наведванняў паліклінік беларусы з'яўляюцца сусветнымі лідарамі? Як спыніць адток кадраў з галіны? Кожны год з медыцыны сыходзяць да 800-1000 спецыялістаў... Між іншым, на ўваходзе ў медыцынскія ВНУ і ССНУ дэфіцыту ахвотных стаць медыкамі не назіраецца. Дык чаму моладзь расчароўваецца ў абранай прафесіі?

Надзея НІКАЛАЕВА.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

22 сакавіка — галоўны ўрач Мінскага гарадскога эндакрыналагічнага дыспансэра Ірына Канстанцінаўна БІЛАДЗІД.

23 сакавіка — намеснік галоўнага ўрача Мінскага гарадскога кардыялагічнага дыспансэра Вольга Канстанцінаўна АПАНАСІК.

24 сакавіка — намеснік дырэктара РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека па поліклінічнай рабоце Кацярына Уладзіміраўна ЦЫТКО.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

22 сакавіка — загадчык хірургічнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Валерый Міхайлавіч ВЕРЫН.

23 сакавіка — старшыня Мінскай міжраённай МРЭК Мінскай вобласці Элеанора Віктараўна ПСАЦІЙ.

24 сакавіка — загадчык дыспансэрнага аддзялення Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Вячаслаў Іванавіч РОСЛІК.

25 сакавіка — загадчык лячэбна-стаматалагічнага аддзялення Мінскай абласной стаматалагічнай паліклінікі Людміла Ананьеўна КОБРЫНА.

Пытальнік

«АД МЕЛАМАНА ДА ІНВАЛІДА»

СЫН бясконца слухае музыку ў навушніках: дома, па дарозе ў школу, позна вечарам. А ў выхадныя дні можа гадзінамі знаходзіцца ў іх. Апошнім часам ён стаў не падобным сам на сябе: нервуецца, лёгка ўзбуджаецца. Я хвалююся. Тым больш, кажуць, што вельмі гучная музыка можа пашкодзіць слых. Ці ёсць тут якія меры перасцярогі?

Вераніка, *г. Брэст.*

Сапраўды, працяглае праслухоўванне на высокай гучнасці небяспечнае. Парушэнні слыху ўзнікаюць ужо пры ўзроўні бесперапыннай гукавой нагрузкі 85 дэцыбел. Такім узроўнем шуму суправаджаецца, напрыклад, вулічны рух у вялікіх гарадах. Пасля кароткачасовага ўздзеяння высокіх узроўняў шуму далікатныя валасковыя клеткі ўнутранага вуха аднаўляюцца. Пры гэтым вастрыня слыху зніжаецца толькі часова і нязначна. Пры паўторным і працяглым уздзеянні шуму гэтыя слыхавыя сенсорныя клеткі пашкоджваюцца больш сур'ёзна і рэгенерацыя іх становіцца немагчымай. Асабліва шкодным лічыцца папулярнае ў моладзі слуханне гучнай музыкі на дыскатэках або праз навушнікі. Інтэнсіўнасць гуку ў навушніках можа дасягаць 110—120 дэцыбел. Такую гучнасць без шкоды для здароўя можна слухаць не больш як 30 секунд.

Умовы, у якіх знаходзіцца ваш сын, аналагічныя тым умовам, што прыводзяць да прафесійных парушэнняў. Калі з-за моцнага і працяглага шуму наступае тугавухасць і нават глухата.

Пры ўзнікненні першых прыкмет тугавухасці неабходна захоўваць бясшкодны ўзровень шуму ў 20—30 дэцыбел. Часам урачы нават прапісваюць спецыяльныя супрацьшумавыя навушнікі. Але не заўсёды ўдаецца вярнуць слых без хірургічнага ўмяшання. У шэрагу выпадкаў даводзіцца рабіць аперацыю. Або ж карыстацца слыхавым апаратам, як гэта робяць людзі пры старэчай глухаце.

Магчыма, юнак імкнецца атрымаць ад гучнай музыкі стымулюючы эфект. Бо вялікая гучнасць выклікае стрэсавы стан. Пры гэтым у кроў паступае так званы «стрэсавы гармон» адрэналін. Ён трансфармуецца ў рэчыва, якое ўздзейнічае на свядомасць, як наркотык.

Выснова напрошваецца сама сабой — лепш за ўсё слухаць нягучную музыку і без усякіх навушнікаў. Але моладзь часта не бярэ да ўвагі словы бацькоў. Таму, калі сын ніяк не настроены адмаўляцца ад праслухоўвання плээра, вазьміце сабе на ўзбраенне наступныя рэкамендацыі:

● Набудзьце для яго высакаякасныя плээр і навушнікі. Калі гук якасны, то не патрабуецца моцнае павелічэнне гучнасці.

● Гучнасць варта настройваць адразу ж пасля ўключэння музыкі. Для настройкі бяспечнай гучнасці праслухоўванне пачынаецца на нізкай гучнасці. Павольна павялічваецца гучнасць да той пары, пакуль гук не будзе чуваць дастаткова чыста і без скажэнняў.

● Для вушэй неабходны рэгулярны адпачынак — 15-хвілінныя перапынкі кожную гадзіну, калі гучнасць мелодый перавышае 85 дэцыбел.

● Вялікая ўвага — на шумавую абстаноўку. На дыскатэцы, на канцэртах варта трымацца далей ад узмацняльнікаў. Можна для засцярогі выкарыстаць берушы. Яны зробленыя так, што не блакіруюць слых цалкам, а прапускаюць пэўныя гукі.

● Назірайце за слыхам. Спытайце ў сына: ці бываюць у яго выпадкі, калі ён не чуе званок у дзверы? Ці няма ў яго адчування, што нізкія мужчынскія галасы ён чуе лепш, чым жаночыя і дзіцячыя? Ці ўзнікае ў яго адчуванне, што большасць людзей гаворыць невыразна? Ці часта яго просяць гаварыць цішэй? У выпадку станоўчых адказаў юнаку неабходна звярнуцца па медыцынскую дапамогу.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Хто нажываецца на м²?

АДКАЗ на гэтае пытанне добра ведаюць у Камітэце дзяржкантролю краіны, дзе праведзены дакладны аналіз дзейнасці некаторых структур будаўнічай галіны, якія працуюць па так званых «шэрых», або «чорных» схемах. Будаўніцтва — адна з найбольш крыміналізаваных галін эканомікі краіны. Чвэрць крымінальных спраў, якія заведзены летась Дэпартаментам фінансавых расследаванняў КДК Гомельскай вобласці, выяўлена менавіта ў гэтай галіне, адзначае начальнік управлення арганізацыі Віктар КАСЦЮЧЭНКА:

— Распаўсюджаныя з'явы — не толькі ўхіленне ад уплаты падаткаў, але і незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць і карупцыйныя злачынствы: злоўжыванні, перавышэнне ўлады, крадзяжы.

Пра тое, якія схемы выкарыстоўваюць занадта «прадпрымальныя» будаўнікі, падрабязна распавёў на нарадзе ў Мазыры **намеснік міністра па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Васіль КАМЕНКА**:

— Вялікую праблему ўяўляюць фізічныя асобы, якія вядуць незарэгістраваную прадпрымальніцкую дзейнасць, звязаную з правядзеннем рамонтна-будаўнічых работ. Таксама мы сутыкаемся з фальсіфікацыяй уліковых звестках, якія прыводзяць да заніжэння выручкі і завышэння затрат. Такім чынам зніжаюцца падаткі ў бюджэт. Самае грубае парушэнне — выкарыстанне рознага роду схем, у тым ліку з прыцягненнем прадпрымальніцкіх структур. У аднаго падрадчыка можа быць да 5 субпадрадчыкаў — такім чынам урэшце заблытваюцца ўсе фінансавыя дакументы. Ліберальнае беларускае заканадаўства сёння не дае магчымасці прыцягнуць да адказнасці тых, хто ажыццяўляе такую дзейнасць.

Найбольш распаўсюджаная схема сыходу ад падаткаабкладання — афармленне падрадчыкам фіктыўных дагавораў субпадраду і актаў прыёмкі выкананых работ з ілжэструктурамі. Пры гэтым работы фактычна выконваюцца сіламі самога падрадчыка або з прыцягненнем нелегальнай працоўнай сілы.

Яшчэ для аднаго кірунку лжэпрадпрымальніцкай дзейнасці характэрныя правапарушэнні, звязаныя з нядобрасумленным і неабгрунтаваным пасрэдніцтвам, якое выкарыстоўваецца для завышэння кошту таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў, вываду абаротных сродкаў арганізацый у нелегальны абарот, атрымання наяўных грошай, што, як следства, вядзе да асабістага ўзбагачэння зацікаўленых асоб і падаражэння будаўніцтва. Выяўляюцца і выпадкі крадзяжу бюджэтных грашовых сродкаў, калі падрадчык у змове са службовымі асобамі заказчыка ўключае ў разліковыя дакументы (акты здачы-прыёмкі выкананых будаўнічых работ) фактычна нявыкананыя работы. Так, супрацоўнікамі Камітэта дзяржкантролю і фінансавай міліцыі КДК была спынена злачынная дзейнасць дырэктара мазырскага будаўнічага прадпрыемства, які здзейсніў шэраг наўмысных злачынстваў. Пры выкананні будаўніча-мантажных работ на розных аб'ектах ён так завысіў іх аб'ёмы, што ўрэшце з бюджэтных сродкаў «зарабіў» 582 млн рублёў.

Паводле інфармацыі Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю краіны, многія суб'екты гаспадарання будаўнічай галіны, праектныя і навукова-даследчыя інстытуты, якія карыстаюцца паслугамі лжэструктур, не ўсведамляюць ўсяго цяжару наступстваў за зробленае, і таму будзе актывізавана прафілактычная работа, звязаная з інфармаваннем кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый будаўнічага комплексу аб прадугледжаных заканадаўствам мерах адказнасці за лжэпрадпрымальніцтва.

— Будаўнічы комплекс павінен быць ачышчаны ад нядобрасумленных падраздзяленняў, падкрэсліваецца **старшыня Камітэта дзяржкантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЯКАБСОН**. — Аб'ёмы і задачы перад будаўнічым комплексам стаяць вялізныя, давядзецца нарошчваць мускулы і ў будучым. І трэба зрабіць так, каб гэта праца рабілася чыстымі рукамі. Не менш важным застаецца якасць будаўніцтва жылля. На жаль, у Камітэт дзяржкантролю працягваюць паступаць скаргі на якасць жылля, на зрыў нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва, а гэта адно з адным заўсёды звязана.

У той жа час у Мазыры, дзе праходзіла нарада па пытаннях выканання сёлетняга задання па будаўніцтве жылля, быў прадэманстраваны станоўчы прыклад вырашэння праблем, якія існуюць у галіне. **Мазырскі домабудаўнічы камбінат** — сучаснае прадпрыемства, прадукцыя якога адпавядае ўсім еўрапейскім стандартам. Яго **дырэктар Аляксандр СОБАЛЕЎ** расказвае, што ўсё абсталяванне на прадпрыемстве італьянскае, нямецкае і аўстрыйскае:

— На сёння гэта самы сучасны ў Беларусі завод. Ручной працы на прадпрыемстве практычна няма, усё — праз аўтаматыку. Далей плануем павялічваць магутнасць завода і будаваць дамы з аднаслойных панэляў, а наступны крок, паколькі ў Мазыры 700 ахвотных жыць у аднакватэрных дамах, мы вырашылі будаваць і іх. Гэта будуць дамы новага пакалення, якіх пакуль няма ў краіне: першы паверх памерам 91 метр квадратны і такі ж — мансарды. Унутры гаспадары зробяць тую планіроўку, якую яны жадаюць.

Старшыня Камітэта дзяржкантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр Якабсон адзначае, што абсталяванне, якое было набыта Мазырскім домабудаўнічым камбінатам за кошт замежных крэдытных ліній, дае такую аддачу, што ўжо сёння зразумела — замежны крэдыт будзе выплачаны раней, чым запланавана дагаворам:

— Гэта прыклад для іншых будаўнічых арганізацый рэспублікі, як магчыма праводзіць мадэрнізацыю і рэканструкцыю ўсіх прамысловых баз будаўнічых арганізацый. Мы выходзім з прапановай да кіраўніка дзяржавы аб тым, каб беларускія будаўнічыя арганізацыі атрымалі права ўзводзіць за межамі Беларусі да 10% буйнапанэльных дамоў, якія будуюцца ў рэспубліцы. Сёння ў Расіі рэнтабельнасць будаўніцтва жылля складае ў сярэднім ад 30 да 40 %. Вось крыніца заработку валюты. Гэты вопыт мы будзем распаўсюджваць на ўсю рэспубліку.

Пашырэнне прысутнасці беларускіх будаўнікоў за мяжой абумоўлена тым, што гэта адзін з эфектыўных спосабаў прыцягнення валютных сродкаў на мадэрнізацыю вытворчасцяў, а таксама аплату абавязацельстваў па ўжо прыцягнутых крэдытах. Той жа ААТ «Мазырскі ДБК», які правёў карэнную мадэрнізацыю вытворчасці шляхам прыцягнення замежных крэдытаў, зараз выплачвае гэты крэдыт за кошт экспарту сваёй прадукцыі. У прыватнасці, летась камбінат зарабіў амаль $ 1 млн пры будаўніцтве 60-кватэрнага дома ў Навазыбкаве Бранскай вобласці. На бліжэйшыя чатыры гады прадпрыемства ўжо заключыла дагаворы з заказчыкамі са Смаленскай вобласці.

Дарэчы, сёлета ў краіне неабходна ўвесці ў эксплуатацыю 7,5 млн кв. метраў жылля. Гэта на 11 % больш, чым летась. Па папярэдніх звестках, у першым квартале ў Беларусі чакаецца недавыкананне задання па ўводзе жылля — будзе пабудавана 1,2 млн кв.м — гэта 16 % гадавога задання, хоць першапачаткова планавалася 20 %. Між тым, па словах **міністра архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Анатоля НІЧКАСАВА**, у Савет Міністраў ужо ўнесена прапанова выправіць ўнутранае аздабленне жылля, якое будуецца з выкарыстаннем ільготных крэдытаў, не ў абавязковым парадку, а па пісьмовай згодзе дольшчыкаў. Рашэнне пра абавязковае аздабленне льготнага жылля, якое было прынята летась, прывяло не толькі да незадаволенасці часткі дольшчыкаў, але і да падаражэння будаўніцтва, павелічэння нарматыўных тэрмінаў яго ўзвядзення.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Спажывец

Прадукты купіў і ў... бальніцу?

20 работнікаў сферы гандлю і бытавога абслугоўвання на Віцебшчыне былі вызвалены ад займаемых пасад і больш за 400 прыцягнуты да іншай дысцыплінарнай адказнасці па выніках праверак, якія супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці ажыццявілі летась.

Ва ўсіх з 250 праверэных гандлёвых кропак устаноўлены розныя парушэнні заканадаўства пры рэалізацыі тавараў. Стала не выключэннем у лістападзе мінулага года праверка крам Полацкага РайПа, дзе былі ўстаноўлены парушэнні правілаў рознічнага гандлю, санітарных нормаў. Меліся і тавары, тэрмін дазволенага ўжывання якіх даўно скончыўся. Напрыклад, у краме ў вёсцы Багушэва ў продажы знаходзілася больш за дваццаць найменняў пратэрмінаваных тавараў на суму звыш 700 тысяч рублёў. Некаторыя прадукты нельга было ўжываць ужо больш за год і сем месяцаў! Курыныя паўфабрыкаты (філе, грудка, шынка) трэба было ўбраць з рэалізацыі яшчэ ў чэрвені, снежні 2009-га і маі 2010-га года...

Пры праверцы крам Шумілінскага РайПа ў краме «Цэнтральны», якая дзейнічае ў раённым цэнтры, рэалізоўвалі на момант праверкі пратэрмінаваныя шашлык, пельмені, каўбасныя вырабы, салату з квяцістай капусты.

І ў абласным цэнтры, як у глыбінцы, аказваецца, бывае небяспечна купляць прадукты. У праверэных крамах ААТ «Віцебскія прадукты» (а кантралёры зайшлі туды ў кастрычніку 2010-га) пакупнікам прапаноўваліся сасіскі, шашлык, сушкі і гэтак далей, ужыванне якіх магло нанесці шкоду здароўю пакупнікоў.

Не лішнім будзе нагадаць: заўсёды трэба быць уважлівымі пры выбары прадуктаў харчавання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАВОДКА ПАЛЕССЮ НЕ ПАГРАЖАЕ?

Трохі знізіўся ўзровень вады ў рацэ Прыпяць ля вёскі Чэрнічы Жыткавіцкага раёна (-3 см). Цяпер ён складае 518 см. У Петрыкаве «палеская амазонка» таксама спыніла пад'ём вады. І толькі ў Мазыры і Мазырскім раёне дадала 3 сантыметры. Цяпер на рацэ назіраецца крыгаход і шугаход. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, падтопленымі на Гомельшчыне застаюцца 17 населеных пунктаў — 5 жылых дамоў, 4 дачы, 92 падворкі, 22 сельскагаспадарчыя пабудовы, 6 участкаў дарог. Агульная плошча падтаплення складае 2,4 га.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Як нас дураць

АДНА КВАТЭРА НА ПЯЦЯРЫХ

Мінчанка брала перадаплату ў людзей, якія хацелі зняць у яе кватэру, аднак жыллё не здавала і грошы не вяртала.

31-гадовая жанчына, паводле звестак прэс-афіцэра Фрунзенскага РУУС Алы Галубовіч, размясціла ў інтэрнэце аб'яву пра тое, што здае двухпакаёвую кватэру па праспекце Пушкіна. Раней судзімая за распаўсюджванне наркотыкаў такім чынам хацела паправіць сваё фінансавае становішча. Праўда, з кліентамі яна была не да канца шчырай: кватэру ахвотнікам паказвала, перадаплату брала, але калі тыя прыязджалі з рэчамі, каб засяліцца, у жыллё не пускала. За паўтара месяца махлярка падобным чынам падманула пяцярых кліентаў, якія звярнуліся па дапамогу ў міліцыю.

Ігар ГРЫШЫН.

Филиал «Эксперт-Услуга» КПУП «Гомельоблреклама» (организатор аукциона) извещает о проведении 26 апреля 2011 года открытого аукциона по продаже имущества (лигнин и целлолигнин гидролизные) в 10.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18

Лот №	Наименование объекта	Начальная цена продажи (с НДС), руб.	Задаток (с НДС), руб.	Краткая характеристика объекта
1	Лигнин и целлолигнин гидролизные 175 000 тонн	2 205 000 000	44 100 000	Лигнин гидролизный получается при гидролизе древесного сырья (щепы, опилок), разбавленного серной кислотой. Целлолигнин гидролизный получается при гидролизе одубины или древесного (лиственного) сырья бескислотным методом. Лигнин и целлолигнин гидролизные применяются в качестве выгорающей добавки при производстве легковесных мелкопористых огнеупоров, в качестве углеродистого восстановителя в производствах черной и цветной металлургии, как топливо для тепловых электростанций, в производстве топливных брикетов.
2	Лигнин и целлолигнин гидролизные 150 000 тонн	1 890 000 000	37 800 000	
3	Лигнин и целлолигнин гидролизные 100 000 тонн	1 260 000 000	37 800 000	
4	Лигнин и целлолигнин гидролизные 50 000 тонн	630 000 000	31 500 000	
5	Лигнин и целлолигнин гидролизные 25 000 тонн	315 000 000	31 500 000	внешний вид: масса темно-коричневого цвета с характерным запахом
6	Лигнин и целлолигнин гидролизные 150 000 тонн	1 890 000 000	37 800 000	массовая доля влаги, %, не более: 70
7	Лигнин и целлолигнин гидролизные 75 000 тонн	945 000 000	28 350 000	массовая доля золы, %, не более: 10
8	Лигнин и целлолигнин гидролизные 50 000 тонн	630 000 000	31 500 000	массовая доля кислот в пересчете на серную кислоту, %, не более: 1,5
9	Лигнин и целлолигнин гидролизные 25 000 тонн	315 000 000	31 500 000	

Продавец: Республиканское унитарное предприятие «Речицкий опытно-промышленный гидролизный завод», Гомельская область, г. Речица, ул. Ильича, 1. Тел.: (8 02340) 45510, 39053.

Имущество расположено по адресу: лот № 1, № 2, № 3, № 4, № 5 – д. Деражня, Речицкий район, Гомельская область; лот № 6, № 7, № 8, № 9 – д. Казазаевка, Речицкий район, Гомельская область.

Ознакомиться с вышеуказанным имуществом можно в рабочие дни с 8.00 до 16.00 по адресу: Гомельская область, г. Речица, ул. Ильича, 1.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет продавца (РУП «Речицкий ОПГЗ») № 3012000370017 в отделении ОАО «БПС-Банк» г. Речицы, ул. Урицкого, 19а, БИК 151501356, УНП 400016685 по **19 апреля 2011 г**. включительно.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу : ул. Гагарина, 20, каб. 2-18 г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по **19 апреля 2011 г**. включительно.

К заявлению прилагаются следующие документы:

1. Копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении о проведении торгов.

2. Индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации.

3. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица.

4. Иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (без нотариального засвидетельствования).

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с законодательством.

6. При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем аукциона будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем аукциона, обязано: подписать протокол о результатах аукциона, заключить договор купли продажи в срок не позднее 10 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, до 1 июля 2011 г. оплатить приобретаемое имущество и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Аукцион проводится в соответствии с требованиями: Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)», Методических рекомендаций об особенностях оценки и продажи имущества должника, находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства), утвержденных Приказом Министерства экономики Республики Беларусь от 29.11.2010 г. № 144, и Плана ликвидации РУП «Речицкий ОПГЗ».

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона, отказ от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Контактные телефоны организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

31 марта 2011 г. **повторно проводит открытый** *аукцион* **по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

		Лот 1	Лот 2
1	Адрес земельного участка	Горанский с/с, д. Тейки	Лошанский с/с, а/г Лошаны
2	Кадастровый номер	623681317601000028	623684005601000274
3	Площадь земельного участка	0,2028 га	0,1500 га
4	Целевое назначение

Мінскі гадзіннікавы завод «Прамень» («Луч»)

«ПРАМЕНЬ» ВЯРТАЕ БЫЛУЮ СЛАВУ

З ГІСТОРЫІ І СУЧАСНАСЦІ ЗАВОДА. **Мінскі гадзіннікавы завод быў узведзены з першапачатковай мэтай задаволіць у былой савецкай краіне попыт на жаночыя наручныя гадзіннікі. У снежні 1955 года на ім увялі ў эксплуатацыю першы зборачны канвеер, а ў наступным годзе былі выпушчаны першыя 57 тысяч жаночых наручных гадзіннікаў «Заря». У тым жа годзе гадзіннікам завода прысвоена гандлёвая марка «Прамень».**

Мінскі гадзіннікавы завод удастоены многіх прэстыжных міжнародных узнагарод, яшчэ ў 1999 годзе адным з першых у рэспубліцы атрымаў сертыфікат адпаведнасці яго сістэмы менеджменту якасці патрабаванням міжнародных стандартаў. У свой час (а гэта быў час мінімізацыі) на ім быў выпушчаны адзін з самых мініяцюрных у свеце жаночых гадзіннікаў памерамі з 1-капеечную манету, прычым механізм гэтага гадзінніка мацаваўся на 17 рубінавых камянях.

Цяпер на Мінскім гадзіннікавым заводзе выпускаюцца наручныя жаночыя і мужчынскія гадзіннікі, а таксама інтэр'ерныя, кішэнныя, настольныя, аўтамабільныя гадзіннікі, будзільнікі; яшчэ раней на ім быў асвоены выпуск электронна-механічных гадзіннікаў, або так званых кварцавых.

Усяго прадпрыемства мае ў сваім асартыменце каля 1600 найменняў гадзіннікавай прадукцыі. Канструктары завода няблага працуюць над знешнім афармленнем гэтай прадукцыі, прычым на заводзе для знешняга пакрыцця гадзіннікаў шырока выкарыстоўваюцца сучасныя матэрыялы — напрыклад, такі сплаў, як цырконій. Спецыялісты завода падкрэсліваюць высокую надзейнасць іх гадзіннікавай прадукцыі па санітарна-тэхнічных нормах: сплавы, якія выкарыстоўваюцца для вырабу карпусоў гадзіннікаў, не шкодныя для здароўя.

Дакладнасць ходу гадзіннікаў Мінскага гадзіннікавага завода вызначаецца цяпер з дапамогай хранометраў, або механічных эталонных прыбораў. Гэты метад, аднак, ужо адыходзіць у мінулае, і ўжо ў красавіку на заводзе павінен быць задзейнічаны камп'ютар, на які дакладны час будзе паступаць з інтэрнэту.

На Мінскім гадзіннікавым заводзе былі выраблены спецыяльныя гадзіннікі для дэлегатаў IV Усебеларускага сходу.

НЕКАЛІ вельмі неблагую славу меў Мінскі гадзіннікавы завод «Прамень», гадзіннікі якога разыходзіліся мільённымі тыражамі. Прычым гадзіннікі з маркай «Прамень» добра ведалі не толькі ў былой неабсяжнай савецкай краіне, але і ў многіх краінах свету. Усяго ж у ранейшай савецкай краіне было 17 гадзіннікавых заводаў — Мінскі гадзіннікавы займаў сярод іх вядучае месца, прычым забяспечваў усе астатнія заводы сваімі гадзіннікавымі механізмамі. Каб больш наглядна можна было ўявіць ранейшыя магутнасці і магчымасці Мінскага гадзіннікавага завода, адзначым: раней на ім працавала больш за 10 тысяч чалавек. А з цягам часу тут засталося ўсяго каля тысячы...

З цягам часу прыйшлі на завод і іншыя не зусім прыемныя змены. І ў прыватнасці, такая з іх: многія з некалі папулярных і, увогуле, даволі надзейных гадзіннікаў Мінскага завода з добра вядомай маркай «Прамень» занялі надзейнае месца ў складскіх памяшканнях. Завод аброс вялікімі даўгамі, перад ім замаячыла перспектыва поўнага банкруцтва. І, увогуле, пытанне аб эканамічнай недзеяздольнасці прадпрыемства было разгледжана гаспадарчым судом...

Усё гэта здарылася пасля таго, як прадпрыемства было акцыянавана і поўнасцю перайшло ў рукі новых гаспадароў — прыватных акцыянераў, якія, між іншым, найлепшае выйсце з таго становішча, што склалася, убачылі ў распродажы яго маёмасці.

* * *

Пра тое, чаму прыватныя акцыянеры аказаліся такімі неэфектыўнымі, яшчэ будзе сказана. Цяпер жа зазначым: сёння Мінскі гадзіннікавы завод вяртае былую славу. І яго гадзіннікі сёння карыстаюцца гэткім жа неблагім попытам, як і раней. У перадсвяточныя сакавіцкія дні мы пабывалі на Мінскім гадзіннікавым, а разам з тым і ў яго фірменным магазіне, што размешчаны побач з цэнтральнай прахадной — памяшканне гэтага магазіна не пуставала, наведвальнікі ў ім былі пастаянна. Відаць, тут жа варта праінфармаваць патэнцыйных пакупнікоў: у фірменнай краме завода дзейнічае 10-працэнтная гандлёвая нацэнка, у той час як у іншых гандлёвых аб'ектах яна на гадзіннікі завода складае 30—35 працэнтаў.

Аднак мы крыху адышлі ад тэмы... Ад поўнага банкруцтва Мінскі гадзіннікавы завод выратавала дзяржава, якая, па сутнасці, вярнула яго ў сваю ўласнасць і пры гэтым пагасіла большую частку яго даўгоў — 32 мільярды рублёў з 52 мільярдаў, якія меліся на гэтым незайздросным рахунку (больш дакладна — гэты працэс назвалі рэструктурызацыяй); астатняя частка даўгоў пагашана ўжо самім заводам, пры новым кіраўніцтве. Пры гэтым быў складзены план яго санацыі, на ім з'явіўся антыкрызісны кіраўнік (дакладней — такіх, антыкрызісных, кіраўнікоў, да цяперашняга, было два). А летась, восенню, на Мінскі гадзіннікавы завод прыйшла швейцарская фірма, якая выкупіла 52 працэнты яго акцый і сумесна з якой тут цяпер распрацоўваюцца новыя ўзоры прадукцыі. Хоць пры гэтым яшчэ раз падкрэслім: цяперашняя калекцыя гадзіннікаў з мінскай маркай «Прамень» мае надзвычай прывабны, прэзентабельны выгляд і вельмі няблага разыходзіцца. У цэлым жа тыя санацыйныя мерапрыемствы, якія былі праведзены на заводзе, удыхнулі ў яго новае жыццё.

З ЦЯПЕРАШНЯЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗАВОДА «ПРАМЕНЬ»: АСОБНЫЯ ЛІЧБЫ І ФАКТЫ.

У апошнія гады прадпрыемства прырастае штогод у аб'ёмах на 20—30 працэнтаў.

На 1 студзеня 2007 года доля гадзіннікавай прадукцыі завода займала на ўнутраным рынку 5 працэнтаў, цяпер займае 30—35 (дарэчы, некалі было 60 працэнтаў).

Летась экспарт мінскіх гадзіннікаў з маркай «Прамень» склаў у адносінах да папярэдняга года амаль 180 працэнтаў. Прадпрыемства экспартуе ў Расію, ЗША, Германію, Францыю, Балгарыю, Казахстан, Азербайджан і іншыя краіны, усяго — у 14 краін.

Сума чыстага прыбытку за мінулы год склала 1710 мільёнаў рублёў, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі — 9,8 працэнта.

* * *

Аднак да гадзіннікаў, а разам з тым да перспектыў развіцця гэтай гадзіннікаў з мінскай маркай «Прамень» мае надзвычай прывабны, прэзентабельны выгляд і вельмі няблага разыходзіцца. У цэлым жа тыя санацыйныя мерапрыемствы, якія былі праведзены на заводзе, удыхнулі ў яго новае жыццё.

З ЦЯПЕРАШНЯЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗАВОДА «ПРАМЕНЬ»: АСОБНЫЯ ЛІЧБЫ І ФАКТЫ.

У апошнія гады прадпрыемства прырастае штогод у аб'ёмах на 20—30 працэнтаў.

На 1 студзеня 2007 года доля гадзіннікавай прадукцыі завода займала на ўнутраным рынку 5 працэнтаў, цяпер займае 30—35 (дарэчы, некалі было 60 працэнтаў).

Летась экспарт мінскіх гадзіннікаў з маркай «Прамень» склаў у адносінах да папярэдняга года амаль 180 працэнтаў. Прадпрыемства экспартуе ў Расію, ЗША, Германію, Францыю, Балгарыю, Казахстан, Азербайджан і іншыя краіны, усяго — у 14 краін.

Сума чыстага прыбытку за мінулы год склала 1710 мільёнаў рублёў, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі — 9,8 працэнта.

* * *

Аднак да гадзіннікаў, а разам з тым да перспектыў развіцця Мінскага гадзіннікавага завода ў саюзе са швейцарскай фірмай, якая спецыялізуецца на тых жа гадзіннікаў, мы яшчэ звернемся, а цяпер крыху скажам пра... вокны ПВХ. І ўвогуле — наладзім у адрас гэтых вокнаў здравіцу.

Вокны ПВХ! Каб іх і не было, іх варта было б спецыяльна прыдумаць. Колькі прадпрыемстваў звярталіся да іх, калі адчувалі ў сябе тыя або іншыя цяжкасці. Карацей кажучы, хоць дзяржава ў свой час і выручыла Мінскі гадзіннікавы завод, але ж далей трэба было выжываць самастойна. А той колькасці гадзіннікавай прадукцыі, што выпускалася на час санацыйных мерапрыемстваў, было далёка не дастаткова для таго, каб нарошчваць аб'ёмы. Трэба было шукаць новыя рынкі збыту, новых пакупнікоў.

Такім чынам, з'явіліся на Мінскім гадзіннікавым прадпрыемстве і вокны ПВХ, ці дакладней — з'явіліся і тут.

А найбольшую ўвагу ўдзялілі на ім сваёй ранейшай вытворчасці пячатных плат, якая таксама тут існавала і на час пачатку санацыйных мерапрыемстваў была практычна разбуранай.

А што такое пячатная плата? Гэта гатовая, створаная на аснове шклотэксталіту, з усімі яе разводкамі і пайкамі электрычная схема (у адпаведнасці з прынцыповай схемай заказчыка) для таго ці іншага электроннага блока кіравання, у якую, як выказалася начальнік аддзела пячатных плат Таіса Багдашыч, заставалася пасадзіць мазгі, або адпаведныя мікрасхемы.

Сталі вырабляць такія блокі для тралейбусаў «Белкамунмаша», для бытавой тэхнікі «Белвара» і тэхнікі іншых прадпрыемстваў. А апошнім часам самым перспектыўным кірункам у гэтым плане ўбачылі на Мінскім гадзіннікавым заводзе выраб навігацыйных прыбораў, патрэбнасць розных ведамстваў у якіх — немалая. Напачатку навігацыйныя прыборы завода прызначаліся для работы ў сістэме GPS, цяпер жа тут ствараюць прыбор, які павінен працаваць як у сістэме GPS, так і ў расійскай сістэме «Гланас».

ДА ВЕДАМА. Прымяненне тэхнікі з установленымі на ёй навігацыйнымі прыборамі, напрыклад, у лясной гаспадарцы дазваляе эканоміць нямала паліва, ці, дакладней, папярэджваць яго зліванне «налева». Навігацыйны прыбор дазваляе дакладна прасачыць сапраўдны маршрут вадзіцеля, а значыць, пазбегнуць сітуацый, калі апошні замест 150 пройдзеных лясных кіламетраў мог запісаць 350.

І яшчэ: Расія ў хуткім часе не будзе імпартаваць тэхніку, не абсталяваную навігацыйнымі прыборамі, а як вядома, гэта асноўны імпарцёр нашай тэхнікі.

Але ўжо можна зрабіць пэўныя высновы. Такім чынам, калі крыху падсумаваць вышэйсказанае, можна зазначыць: тая ж працэдура прызнання эканамічнай неплацежаздольнасці і наступнай санацыі пайшла Мінскаму гадзіннікаваму заводу яўна на карысць, яна яўна паўплывала на гаспадарчую свядомасць тых, хто працаваў тут, на змяненне яе ў рыначным кірунку. А менавіта гэта, відаць, і патрэбна нам у першую чаргу.

* * *

Падчас нашага візіту на Мінскі гадзіннікавы завод мы, вядома ж, сустрэліся з яго дырэктарам Мікалаем Гаеўскім (дарэчы, ён быў тут і трэцім па ліку антыкрызісным кіраўніком).

— Мікалай Максімавіч, а ўвогуле, ці перспектыўнай застаецца (і застанецца) гадзіннікавая справа, якая і надалей выбрана на прадпрыемстве ў якасці асноўнай? Функцыянальнае прызначэнне гадзінніка — добра вядомае, а цяпер жа навокал мабільныя тэлефоны, іншыя электронныя прыборы са сваімі «гадзіннікамі»...

— Звычайны гадзіннік (зразумела, ужо ў яго сучасных знешніх варыянтах) ніколі не выйдзе з моды. Прычым ён цяпер, акрамя выканання ім яго асноўнай функцыі, усё больш выступае і як прадмет упрыгажэння, прэстыжнасці. І выпуск гадзіннікаў, нягледзячы на тое ж нашэсце электронных прыбораў, застанецца і надалей увогуле выгаднай справай. Неадноўчы быў у Швейцарыі, у нашых цяперашніх партнёраў, якія якраз цвёрда арыентаваныя выключна на выпуск гадзіннікаў. Дык вось, гэта справа з'яўляецца менавіта для іх вельмі выгаднай. Так, цяпер кампанія выпускае гадзіннікі коштам нават ад 5 тысяч еўра і вышэй. У іх асартыменце сустракаюцца гадзіннікі, якія каштуюць паўтара мільёна еўра, прычым заказаў на такія гадзіннікі дастаткова, наперад...

— Ну, нашага пакупніка такімі лічбамі лепш і не дражніць...

— А ў швейцарскай кампаніі цікавасць да нашага рынку зусім іншая — яны збіраюцца арыентавацца на выпуск гадзіннікаў, галоўным чынам, ад 20 долараў да 2 тысяч, або на менш заможнага і сярэдняга пакупніка. Разлік — менавіта на такі сегмент нашага рынку. А яшчэ — на Расію, у цэлым на Мытны саюз, разлік таксама на Іран, Венесуэлу (вядома, праз нас) і некаторыя іншыя краіны.

— Вашы цяперашнія гадзіннікі на складзе не залежваюцца, як ранейшыя, але ж і аб'ёмы далёка не тыя. Напрошваецца пытанне: як суадносіцца ваша цяперашняя работа выключна на спажыўца з агульнай у краіне ўстаноўкай менавіта на няспыннае, па сутнасці, нарошчванне аб'ёмаў?

— Перш за ўсё адзначу, што мы ў сябе яшчэ не пазбавіліся тых запасаў, што былі накоплены падчас ранейшай працы прадпрыемства. Гэта для нас цяпер, можна лічыць, адна з галоўных праблем. А што датычыць сутнасці пытання, скажу так: безумоўна, маем на ўвазе аб'ёмы і мы. Ёсць аб'ёмы — значыць, ёсць і большыя грошы, большая маса прыбытку. Але гэта павінны быць цалкам ліквідныя аб'ёмы, якія не затрымаліся б на складах. Цяперашні курс прадпрыемства — выключна на попыт...

З ПАЛІТЫКІ ПРАДПРЫЕМСТВА Ў ГАЛІНЕ ЯКАСЦІ

- **Вывучэнне кан'юнктуры рынку.**
- **Асваенне новых вырабаў на аснове спажывецкага попыту.**
- **Пастаяннае ўдасканаленне сістэмы менеджменту якасці.**
- **Стабільны выпуск прадукцыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічнай дакументацыі.**
- **Павышэнне кваліфікацыі работнікаў, стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць пастаяннае паляпшэнне якасці прадукцыі.**
- **Аналіз і ўмацаванне сувязяў з надзейнымі пастаўшчыкамі камплектуючых.**
- **Укараненне новых тэхналогій.**
- **Пашырэнне і паляпшэнне сэрвіснага абслугоўвання.**

Варта дадаць: вяртанне гадзіннікаў «Праменя» з гандлю не перавышае цяпер 3 працэнтаў, што лічыцца добрым паказчыкам. І яшчэ: прадпрыемства поўнасцю аднавіла працу сваіх гарантыйных майстэрняў, якія дзейнічаюць як у буйных абласных гарадах, так практычна і ва ўсіх раённых цэнтрах, а таксама, вядома ж, у Мінску.

* * *

З прыходам швейцарскага інвестара марка «Прамень» на мінскім заводзе, тым не менш, застаецца. Разам з тым, пасля запуску ў вытворчасць новай калекцыі гадзіннікаў, пра што ўжо зазначалася, на іх з'явіцца апазнавальны знак і швейцарскай фірмы, што, безумоўна, надасць мінскім гадзіннікам большую вагу.

Інвестыцыйны дагавор са швейцарцамі разлічаны на тэрмін да 2019 года. Ён прадугледжвае не толькі распрацоўку новай калекцыі, але і мадэрнізацыю завода, замену на ім старога абсталявання (новае абсталяванне на 1,5 мільярда рублёў ужо паступіла). На прадпрыемстве намячаецца таксама адкрыць ювелірную вытворчасць. У перспектыве таксама асваенне на заводзе новага, больш дасканалага гадзіннікавага механізма, механізма з аўтападзаводам (цяпер 50 працэнтаў гадзіннікавых механізмаў завод імпартуе).

На гэтым наш матэрыял можна было б закончыць, але мы яшчэ не адказалі на пытанне, якое было абазначана на самым пачатку: чаму ж прыватныя акцыянеры аказаліся неэфектыўнымі ўласнікамі? Вось што, у прыватнасці, мяркуе наконт гэтага сам Мікалай Гаеўскі: прыватныя акцыянеры не адчулі сваёй сапраўднай адказнасці за лёс прадпрыемства, аказаліся не гатовымі кіраваць ім, не ўсвядомілі таго, што прадпрыемства — менавіта іх, што яны могуць няблага зарабляць на свае акцыі, мець добрыя дывідэнды. А ў выніку прымаліся зусім не абгрунтаваныя, не прадуманыя рашэнні, былі страчаны рынкі, немалая частка завода за бясцэнак, прычым незаконна, была прададзена (дарэчы, адпаведныя здзелкі былі прызнаны няправільнымі, і прададзеная маёмасць заводу вернута). Як падкрэсліваў Мікалай Гаеўскі, мы яшчэ павінны прайсці ва ўсіх гэтых кірунках свой шлях.

І гэта, сапраўды, так.

Іван БАРАНОЎСКІ.

УНП 100230391

НА ЗДЫМКАХ:

1. Дырэктар Мінскага гадзіннікага завода «Прамень» Мікалай ГАЕЎСКІ.

2. Зборшчыца гадзіннікаў Святлана БУЛДЫК.

3. Загадчыца выставачнай залы Раіса АНАНІЧ пра гадзіннікі можа з захапленнем расказваць вельмі доўга.

4. Начальнік вытворча-зборачнага цэха Васіль ЯКАВУК і кантралёр Вольга СЦЕПАНЕНКА.

5. Начальнік аддзела пячатных плат Таісія БАГДАШЫЧ і Святлана ГАВАРЦОВА на адным з участкаў вытворчасці.

6. Такі наручны гадзіннік нагадвае пра Нацыянальную бібліятэку Беларусі.

7. Гадзіннікі з мініяцюрнымі бронзавымі фігуркамі ўпрыгожаць любы стыльны інтэр'ер.

8. Добрым падарункам стане гадзіннік разам з барометрам і тэрмометрам.

9. Сярод самых модных мадэляў — кішэнны гадзіннік, за шклом якога выразна бачныя ўсе шасцярэнькі.

10. Наручныя гадзіннікі з апошніх мадэляў завода.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва завода.

«Прыхіліліся» Прыхілы да Шубабы

Паміж вялікімі вёскамі Партызанаўка і Новадзявяткавічы на Слонімшчыне губляецца вёсачка Прыхілы. «Прыхіліліся» Прыхілы крыху ў баку ад жвіраванай вясковай дарогі. Здалёк відаць апусцелыя хаты, паламаны плот, запушчаныя сады і агароды. Але адна дагледжаная і «жывая» хата кідаецца ў вочы. Спыніліся каля яе. Убачыўшы машыну, з сенцаў на вуліцу выйшаў мужчына. Мы павіталіся і пазнаёміліся. Вяскоўца звалі Рыгор Дзмітрыевіч ШУБАБА.

— Рыгор Дзмітрыевіч, а ці жыве яшчэ хто ў вашых Прыхілах? — запыталіся мы.

— Няма нікога, я — адзін на ўсю вёску, — адказаў вясковец.

Сапраўды, у вёсцы Прыхілы застаўся толькі адзін жыхар — пенсіянер Рыгор Шубаба. А ў суседняй вёсцы Кісялі даўно ўжо нікога няма. А сто гадоў таму ў Прыхілах пражывалі 216 жыхароў, а ў Кісялях — 145. Паводле перапісу 1897 года, у Прыхілах налічвалася 30 двароў і 203 жыхары. На працягу дзесяцігоддзяў у вёсках-суседзях людзей станавілася ўсё менш і менш. У 1921 годзе ў Кісялях вяскоўцаў засталося толькі 12, а ў Прыхілах — 30.

У пачатку XXI стагоддзя Кісялі зусім апусцелі. Таму адзіны мясцовы жыхар Рыгор Шубаба купіў хату ў Прыхілах і пераехаў бліжэй да людзей. Прайшло некалькі гадоў, і Прыхілы апусцелі: адны памерлі, іншыя пераехалі ў розныя вёскі.

— І мне прапаноўвалі жыллё ў Новадзявяткавічах, але я не хачу адсюль ехаць, мне тут спакойна і добра, — прызнаўся журналістам Рыгор Шубаба.

— А не страшна вам тут, аднаму?

— Ды не, прывык. Летась чатыры разы невядомыя асобы турбавалі ноччу, прасілі то дарогу паказаць, то запалак даць, то папіць вады, але я нікога не пускаў у хату, дый з заезджымі разабраўся хутка.

— Рыгор Дзмітрыевіч, колькі вам гадоў?

— Мне 79 гадоў. Пасля смерці жонкі 9 гадоў жыву адзін. Я 41 год быў у калгасе на розных работах. Куды пасылалі — там і працаваў: то будаўніком, то даглядчыкам жывёлы, то паляводам. Працаваў шчыра, бо цяжкай работы не цураўся.

— А дзеці ў вас ёсць?

— Ёсць дзеткі — сын у Мінску жыве, дачка — у Слоніме. Я часта ў іх бываю, а яны — у мяне. Але я з імі жыць не хачу, не хачу ім перашкаджаць. Пакуль здароўе і ногі трымаюць — буду ў сваіх Прыхілах. У мяне тут ёсць тэлефон, тэлевізар, халадзільнік, мяне абслугоўвае сацыяльны работнік, дровамі я забяспечаны — жыві і радуйся.

Калі мы размаўлялі з Рыгорам Шубабам, да нас падышла **загадчыца мясцовай фермы Надзея АСІПЧЫК**. Адначасова да самых веснічак пад'ехала аўтакрама, і Рыгор Дзмітрыевіч з торбачкай пачаў займацца пакупкамі. А мы запыталіся ў спадарыні Асіпчык пра адзінага жыхара Прыхілаў. «Дзмітрыевіч вельмі добры, шчыры, культурны і паважны чалавек. А галоўнае тое, што не п'е гарэлкі. Я кожны дзень яго наведваю, пытаюся, чым дапамагчы. Гэта сапраўдны прыклад для ўсіх вяскоўцаў. Мы яго вельмі паважаем, нават просім у яго парад. Адсюль ён нікуды не хоча ехаць, яму тут добра. Дый мы да яго прывыклі», — прызналася нам Надзея Асіпчык.

Калі аўтакрама паехала, мы запыталіся ў Рыгора Дзмітрыевіча, што ён сёння купіў. «Узяў малака, хлеба, селядцоў», — кажа вясковец. — Пакуль хопіць. Усё астатняе ў мяне ёсць».

На развітанне мы пацікавіліся: ці сумна аднаму на ўсю вёску? «Ды не, — адказаў пенсіянер. — Людзі мяне наведваюць. Але бывае і так, што дні два прасяджу на лаўцы — і ніхто не прыйдзе, не заедзе».

Сяргей ЧЫГРЫН.
Фота аўтара.

Ну і ну!

СПРАВА «ПАХНЕ» РТУЦЦЮ

Жыхар Смалявічаў асуджаны за збыт амаль 300 грамаў ртуці

44-гадовы мужчына, знаходзячыся нападпітку, скраў у свайго знаёмага колбу з металічнай ртуццю, пасля чаго збыў яе іншаму знаёмаму.

— Следства ўстанавіла, што гаспадар дома, у якога быў здзейснены крадзеж, прынёс ртуць каля 30 гадоў таму з працы і пасля пра яе забыўся, — распавяла **старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна КАЛІНІНА**. — У лістападзе мінулага года ён разам з асуджаным, які гасцяваў у яго, знайшоў у падвале дома колбу з ртуццю, якую госць не прамінуў скрасці.

Мужчына асуджаны па частцы 1 артыкула 333 Крымінальнага кодэкса (за незаконны абарот моцнадзейных ці ядавітых рэчываў) да 1 года і 6 месяцаў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Надзея ДРЫЛА.

22 сакавіка 2011 г. ЗВЯЗДА

Дні культуры Украіны: вялікі танец

21 сакавіка на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага вялікага тэатра оперы і балета адбылося адкрыццё Дзён культуры Украіны ў Рэспубліцы Беларусь — канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага ансамбля танца Украіны імя. П. Вірскага. У цырымоніі адкрыцця ўзялі ўдзел міністр культуры Украіны Міхаіл Кулыняка і міністр культуры Беларусі Павел Латушка.

Ансамбль танца Украіны імя Паўла Вірскага існуе больш за 70 гадоў і вядомы ва ўсім свеце. Сёння ансамбль налічвае больш за сотню артыстаў, а аркестр — некалькі дзясяткаў музыкаў. Вядомы балетмайстар Павел Вірскі кіраваў ансамблем з 1937 да 1975 года. За час працы ў калектыве стварыў больш за пяць канцэртных праграм, у якія ўвайшлі яскравыя харэаграфічныя кампазіцыі «Мы з Украіны», «Лялькі», «Маракі», «Гапак», «Сёстры». Асноўнай асаблівасцю і наватарствам яго пастановак з'яўлялася спалучэнне элементаў народнага танца з акадэмічным і аздабленне танца тэатральным дзеяннем.

З 1980 года ансамбль узначальвае Герой Украіны, народны артыст Украіны Міраслаў Вантух. Пад яго кіраўніцтвам былі створаны харэаграфічныя пастаноўкі, якія ўвайшлі ў залаты фонд украінскай народнай харэаграфіі: «Украінскі танец з бубнамі», «Гуцулка», «Карпаты», «У міры і згодзе», «Украіна, мая Украіна».

Нацыянальны акадэмічны ансамбль танца Украіны імя. П. Вірскага шмат і паспяхова гастралюе. Выступаў у 60 краінах свету. Сёлета і беларусы маюць магчымасць адчуць магію тэмпераментнага ўкраінскага танца.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ИНФОРМАЦИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «СЕЙСМОТЕХНИКА» ЗА 2010 ГОД

№ строки	Наименование показателей	Единица измерения	2010 год
1.	Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	миллионов рублей	37 167
2.	Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	миллионов рублей	28 665
2.1.	из них на оплату труда	миллионов рублей	5 733
3.	Прибыль (убыток) за отчетный период, всего	миллионов рублей	3 118
3.1.	в том числе: Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	миллионов рублей	3 699
3.2.	Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	миллионов рублей	62
3.3.	Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	миллионов рублей	-643
4.	Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	миллионов рублей	1082
5.	Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	86
6.	Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	1253
7.	Нераспределенная прибыль	миллионов рублей	91
8.	Начислено на выплату дивидентов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	91
9.	Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде	рублей	18,87
10.	Количество акционеров, всего	лиц	168
10.1.	в том числе: юридических лиц	лиц	1
10.2.	физических лиц	лиц	167
11.	Среднесписочная численность работающих	человек	548
12.	Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. рублей	10,16
13.	Стоимость чистых активов	миллионов рублей	32 550

УНП 400079509

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ за 2010 год

Открытое акционерное общество «ПРИДНЕПРОВЬЕ»

247485, Республика Беларусь, г. Речица, Гомельская область, ул. Строителей, 2а

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС с 1 января по 31 декабря 2010 г.

(млн руб.)

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
АКТИВ			
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	2432	3231
амортизация	102	987	1263
остаточная стоимость	110	1445	1968
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	1	1
остаточная стоимость	120	1	1
Вложения во внеоборотные активы	140	23	-
ИТОГО по разделу I	190	1469	1969
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	1599	2054
в том числе:			
сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	102	126
расходы на реализацию	214	1	2
готовая продукция и товары для реализации	215	1489	1904
расходы будущих периодов	218	7	22
налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	51	46
Дебиторская задолженность	240	102	325
в том числе:			
покупателей и заказчиков	241	4	4
поставщиков и подрядчиков	242	18	149
по расчетам с персоналом	244	3	4
разных дебиторов	245	75	166
прочая дебиторская задолженность	249	2	2
Денежные средства	260	264	388
ИТОГО по разделу II	290	2016	2813
БАЛАНС (190+290)	**300**	**3485**	**4782**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	87	79
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	-160	-209
Резервный фонд	420	160	-
в том числе:			
резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами	422	160	-
Добавочный фонд	430	1603	2256
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	93	74
ИТОГО по разделу III	490	1783	2200
IV. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Кредиторская задолженность	620	1702	2582
в том числе:			
перед поставщиками и подрядчиками	621	1574	2406
перед покупателями и заказчиками	622	4	7
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	52	68
по налогам и сборам	625	38	81
по социальному страхованию и обеспечению	626	11	19
по лизинговым платежам	627	19	-
перед прочими кредиторами	628	4	1
ИТОГО по разделу IV	690	1702	2582
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**3485**	**4782**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января по 31 декабря 2010 г.

(млн руб.)

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	29150	22475
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	3774	2987
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку (010-011)	020	25376	19488
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ и услуг	030	21235	16236
Валовая прибыль	040	4141	3252
Расходы на реализацию	060	3350	2573
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	791	679
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	14	17
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	3	2
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	11	15
В том числе:			
доходы от операций с активами	093	11	15
Операционные расходы	100	1	1
в том числе:			
расходы от операций с активами	102	1	-
прочие операционные расходы	109	-	1
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	10	14
III. ВНЕОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	30	26
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	3	2
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	27	24
Внереализационные расходы	150	153	5
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-126	19
Прибыль (убыток) (+070+120+160)	200	675	712
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	146	-
Прибыль (убыток) до налогообложения (+200+210-220)	240	821	712
Налог на прибыль	250	166	118
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	31	21
Чистая прибыль (убыток) (200-250-260-270)	300	478	573
Справочно (из строки 300):			
сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310	115	210

Информация о дивидендах и акциях	Ед. изм.		
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн руб.	37	29
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	682	435
Обеспеченность акции имуществом Общества	тыс. руб.	33	24
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	10087	7120

Проверка достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2010 год проведена аудитором-предпринимателем Смоленчук Сергеем Михайловичем (лицензия Министерства финансов РБ на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0495458 от 20.01.2009 г., сроком действия до 25.02.2014 года). УНП 400315195

Решение Минского областного исполнительного комитета от 23 февраля 2011 года № 207.

Об утверждении плана приватизации объектов, находящихся в собственности Минской области, и плана преобразования коммунальных унитарных предприятий, имущество которых находится в собственности Минской области, в открытые акционерные общества на 2011–2013 годы

Минский областной исполнительный комитет РЕШИЛ:

1. Утвердить:

план приватизации объектов, находящихся в собственности Минской области, на 2011–2013 годы согласно приложению 1;

план преобразования коммунальных унитарных предприятий, имущество которых находится в собственности Минской области, в открытые акционерные общества на 2011–2013 годы согласно приложению 2.

2. Признать утратившим силу решение Минского областного исполнительного комитета от 26 августа 2010 г. № 1024 «Об утверждении плана приватизации объектов, находящихся в собственности Минской области, и плана продажи акций открытых акционерных обществ, созданных в процессе разгосударствления и приватизации объектов, находящихся в собственности Минской области, на 2011–2013 гг.».

Председатель **Б.В. Батура**

Управляющий делами **И.С. Маркевич**

Приложение 1 к решению Минского областного исполнительного комитета 23.02.2011 № 207

План приватизации объектов, находящихся в собственности Минской области, на 2011–2013 годы

Раздел I. Коммунальные унитарные предприятия, имущественные комплексы которых подлежат приватизации

№ п/п	Наименование коммунального унитарного предприятия	Предполагаемый срок преобразования
1.	Минское областное коммунальное унитарное предприятие «Молодечненская маслосырбаза»	2011 год

Раздел II. Хозяйственные общества, акции (доли в уставных фондах) которых находятся в собственности Минской области и подлежат приватизации

№ п/п	Наименование хозяйственного общества	Предполагаемый срок приватизации
1.	Открытое акционерное общество «Автобаза»	2011 год
2.	Открытое акционерное общество «Завод Рембыттехника»	2011 год
3.	Открытое акционерное общество «Отделочник-198»	2011 год
4.	Открытое акционерное общество «Передвижная механизированная колонна № 212» г. Молодечно	2011 год
5.	Открытое акционерное общество «Борисовский завод «Металлист»	2011 год
6.	Открытое акционерное общество «Передвижная механизированная колонна № 69»	2012 год
7.	Открытое акционерное общество «Управление производственно-технологической комплектации» Минсквдстрой г. Заславль	2013 год

Приложение 2 к решению Минского областного исполнительного комитета 23.02.2011 № 207

План преобразования коммунальных унитарных предприятий, имущество которых находится в собственности Минской области, в открытые акционерные общества на 2011–2013 годы

№ п/п	Наименование коммунального унитарного предприятия	Предполагаемый срок преобразования
1.	Минское областное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Первомайский»	2011 год
2.	Минское областное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Старо-Борисов»	2011 год
3.	Минское областное унитарное предприятие «Борисовский консервный завод»	2011 год
4.	Минское областное сельскохозяйственное семеноводческое унитарное предприятие «Подберезье»	2011 год
5.	Минское областное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Докторовичи»	2011 год
6.	Минское областное унитарное предприятие «Слуцкий консервный завод»	2011 год
7.	Минское областное производственно-торговое унитарное предприятие «Столбцовский мясокомбинат»	2011 год
8.	Минское областное коммунальное унитарное предприятие «Институт «Борисовпроект»	2012 год
9.	Производственное сельскохозяйственное коммунальное унитарное предприятие «Ивенецкая криница»	2012 год
10.	Минское областное коммунальное унитарное предприятие «Солигорскпроект»	2012 год
11.	Минское областное унитарное предприятие «Слуцкая передвижная механизированная колонна № 1»	2012 год
12.	Минское областное унитарное предприятие «Минское специализированное строительное управление»	2012 год
13.	Коммунальное унитарное предприятие «Ивенецкая птицефабрика»	2012 год
14.	Минское областное производственное унитарное предприятие «Минскоблагрохимизация»	2012 год
15.	Коммунальное производственное унитарное предприятие «Смолевичский опытный завод»	2012 год
16.	Минское областное унитарное предприятие «Автопроторгагросервис»	2013 год
17.	Дочернее унитарное предприятие «Березинский автотехсервис» Минского областного унитарного предприятия «Автопромторгагросервис»	2013 год
18.	Дочернее унитарное предприятие «Пуховичский автотехсервис» Минского областного унитарного предприятия «Автопромторгагросервис»	2013 год
19.	Дочернее унитарное предприятие «Солигорский автотехсервис» Минского областного унитарного предприятия «Автопромторгагросервис»	2013 год
20.	Дочернее унитарное предприятие «Клецкий автотехсервис» Минского областного унитарного предприятия «Автопромторгагросервис»	2013 год
21.	Минское областное специализированное монтажно-эксплуатационное унитарное предприятие «Торнадо-Вест»	2013 год
22.	Минское областное унитарное предприятие «Несвижская укрупненная типография им. С. Будного»	2013 год
23.	Минское областное унитарное предприятие «Борисовская укрупненная типография им. 1 Мая»	2013 год
24.	Минское областное унитарное предприятие «Слуцкая укрупненная типография»	2013 год
25.	Минское областное унитарное предприятие «Червенская типография»	2013 год

УНП 100128686

Страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ **№ 3130345 серия ВС ЗАСО «Белнефтестрах» считать недействительным**. *УНП 101143603*

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району **бланк страхового полиса** по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь **серии ВС № 0107007 считать недействительным**. *УНП 101883943*

СОАО «РЕЧИЦАПИВО»,

247500, г. Речица, ул. Молодежная, 3а, тел. 22551

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

млн руб

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства			
первоначальная стоимость	101	68 332	77 975
амортизация (02)	102	38 897	46 592
остаточная стоимость	110	29 435	31 383
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	10	4
амортизация	112	6	1
остаточная стоимость	120	4	3
Вложения во внеоборотные активы	140	4 037	5 888
ИТОГО по разделу I	190	33 476	37 274
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	16 641	11 903
в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	5 661	6 559
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	7 928	3 826
расходы на реализацию	214		
готовая продукция и товары для реализации	215	1 577	1 467
товары отгруженные	216	299	
расходы будущих периодов	218	1 176	51
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	152	144
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	16 501	24 404
в том числе: покупателей и заказчиков	241	15 670	23 557
поставщиков и подрядчиков	242	446	166
по налогам и сборам	243	312	519
разных дебиторов	245	67	147
прочая дебиторская задолженность	249		
Денежные средства	260	2 117	77
Финансовые вложения	270	36	16
Прочие оборотные активы	280	17	17
ИТОГО по разделу II	290	35 464	36 561
БАЛАНС (190+290)	300	68 940	73 835
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	19 213	19 112
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411		-59
Резервный фонд	420	1	1
Добавочный фонд	430	2 463	6 060
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	X	X
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	-1 439	- 6 165
Целевое финансирование	460		
ИТОГО по разделу III	490	20 238	18 949
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	4 795	1 553
ИТОГО по разделу IV	590	4 795	1 553
БАЛАНС	**700**	**68 940**	**73 835**
долгосрочная кредиторская задолженность	701		
краткосрочная кредиторская задолженность	702	26 368	22 505

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

млн руб

I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	26 456	59 734
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции	011	5 868	12 490
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	20 588	47 244
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	10 455	4 267
Операционные расходы	100	11 526	3 044
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	- 1 413	744
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	531	1 361
Внереализационные расходы	150	5 023	4 250
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов	160	-4 500	- 3 034
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	200	-12 401	- 4 636
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	1 914	687
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения	240	- 10 487	41
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	76	90
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	82	1
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	300	-12 559	-4 727

Количество акционеров – 678.
Дивиденды в данном периоде не начислялись.
Просроченная дебиторская задолженность – 6 675 млн руб.
Просроченная кредиторская задолженность – 103 млн руб.
Среднесписочная численность работающих – 464 чел.
Основной вид деятельности – производство пива.

Руководитель **Н.Е. Савастенко**

Главный бухгалтер **Л.И. Хлебина** УНП 400016657.

ОТЧЕТ ОБ ИСПОЛЬЗОВАНИИ СВОЕГО ИМУЩЕСТВА ЗА 2010

Количество учредителей благотворительного местного фонда «Открытые сердца» – 1 человек, из них 1 – физические лица.

Информация о стоимости имущества благотворительного местного фонда «Открытые сердца» (далее – Фонд):

- Стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет 2855220 белорусских рублей;
- Поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 9626300 белорусских рублей.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет 5789030 белорусских рублей.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса,13А
режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел.: 227 52 36, 226 03 01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 13 (по генплану)» в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-1762 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 15.10.2009 г.

Земельный участок площадью 0,1873 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома – 23-этажное, односекционное со встроенно-пристроенными помещениями общественно-торгового назначения, расположенными на первом и втором этажах. Количество жилых помещений жилого дома – 126. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства – декабрь 2009 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – декабрь 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 26.05.2009 № 1164-5/09.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство нежилых помещений – тренажерного зала, административных помещений, аптеки, промтоварного магазина.

Предметом договора будет являться строительство нежилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра площади по экспликации нежилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет : тренажерный зал – 5087250 руб.; административное помещение № 1 – 4862950 руб.; административное помещение № 2 – 5028090 руб.; административное помещение № 3 – 4909190 руб.; аптека – 5167920 руб.; промтоварный магазин – 4953490 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 03.12.2009 № 27/09, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 7».

Прием и регистрация заявлений на строительство нежилых помещений будет осуществляться в каб. 401 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

И.о. генерального директора **Г.Г. Лапаник**

«ВЕРАБЕЙКА, НЕ СУМУЙ!»

20 сакавіка аматары птушак адзначылі Міжнародны дзень вераб'я. Адсвяткавалі яго і ў Баранавічах — другі раз у нашай краіне.

У цэнтральнай бібліятэцы горада сабралася некалькі дзясяткаў прыхільнікаў птушак і грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», якая і арганізавала гэтае свята.

А святкаванне пачалося з агляду фотавыставы «Пра што спявае вераб'і?». На здымках былі толькі гэтыя птушкі — вераб'і палявыя і дамавыя. А самыя эфектныя фота атрымаліся ў Мікалая Вераб'я. На жаль, самога майстра не было. Пасля цяжкага кулявога ранення спецыяліст заказніка «Выганашчанскае» праходзіць рэабілітацыю. Пра той трагічны стрэл «Звязда» пісала.

Душой мерапрыемства была студэнтка 5-га курса Баранавіцкага ўніверсітэта Юля Траццяк, яна на выдатнай беларускай мове вяла свята, паказвала, як з паперы зрабіць птушачку, падтрымлівала размову...

Быў праведзены і конкурс. Па фатаграфіях неабходна было распазнаць вераб'ёў. А каб адрозніць дамавога ад палявога трэба мець спрактыкаванае вока. Перамог вучань 3 класа Жамчужненскай СШ Дзяніс Шкяр'ятаў, а прывезла хлопчыка на свята настаўніца Любоў Лапкоўская. Пацікавіўся: а чаму не бацькі?

— *Дзяніс у гэтым годзе піша навукова-даследчую работу «Верабей — адна з самых распаўсюджаных птушак на зямлі», а я, як класны кіраўнік, і прывезла яго ў горад. Дзяніс — хлопчык актыўны, і яго бацькі неабыякавыя да прыроды..., — паведала Любоў Аляксандраўна.*

Затым усе накіраваліся да цэнтра горада, дзе стаіць памятны знак верабейку.

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што Баранавічы тут не першапраходцы. У 1860 годзе вераб'я ўвекавечылі ў Бостане. Там птушкі выратавалі ўраджай ад насякомых, і ўдзячныя фермеры паставілі помнік вераб'ю.

Свята прайшло сціпла, але вераб'ям не трэба сумаваць, бо не шмат птушак маюць сваё асабістае свята.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



7				9				
		4	5	6		8		2
					4		9	
2						6		
8			9	2	1			7
		7						3
	3		6					
1		8		5	9	3		
				1				5

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетці, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Блізняты будуць атрымліваць кампліменты, а Дзеву чакае поспех у грамадскай дзейнасці

ВАЕН. Зможаце палепшыць любое з дасягненняў. Для гэтага запатрабуецца ўсяго толькі злёгку гарманізаваць сваю асобу, а таксама развіць назіральнасць і інтуітыўнае разуменне інтарэсаў навакольных і стаць крыху мудрэйшым і больш цярплівым. Да чацвярга варта ўціхамірыць ганарыстасць і прыслухацца да разумных парад калег. Лепшымі днямі ў прафесійнай галіне могуць быць аўторак і пятніца. У выхадныя дні дзецям спатрэбіцца ўвага і спагада.

ЦЯЛЕЦ. Не варта планаваць штосьці сур'ёзнае. Ваша забыўлівасць можа стаць прычынай напружанасці ў адносінах. Міжасобасныя адносіны наогул выйдуць на першы план — у вашых руках як паспяховае вырашэнне старых канфліктаў, так і стварэнне новых праблем сабе і навакольным. На выхадныя паспрабуйце адпачыць ад штодзённага асяроддзя — напрыклад, з'ездзіце на прыроду.

БЛІЗНЯТЫ. Дзіўныя сустрэчы і пацешныя выпадкі будуць змяняцца, як каляровыя шкельцы ў калейдаскопе. Лавіце поспех, выкарыстайце гэты час не толькі для забаў, але і па справе. Па сілах будзе арганізацыя любога цікавага і незвычайнага мерапрыемства. Добры тыдзень для заключэння выгадных дамоў. Не шкадуйце час на зносіны і перасоўванні — усё будзе складацца выдатна. Магчымыя рознагалоссі ва ўзаемаадносінах з дзецьмі: праявіце цярпенне і паспрабуйце пачуць іх меркаванне.

РАК. Тыдзень можа стаць даволі клапатлівым, верагодныя сканжэнні інфармацыі, якая паступае, як па вашым недаглядзе, так і па злым намеры тых, з кім давядзецца мець зносіны. Надыходзіць час жыццёвых змен, і вам неабходна да іх падрыхтавацца. Час развітвацца з састарэлым — рэчы гэта, або адносіны. У канцы тыдня поспех будзе спадарожнічаць у распачынаннях, звязаных з кар'ерай. Аўторак прынясе з сабой некаторае расчараванне і ўскладненні ў адносінах з калегамі. У нядзелю добра рэалізоўваць даўнія планы і задумы.

ЛЕЎ. Задумайцеся аб падвышэнні прафесійнага ўзроўню. Вас чакаюць цікавыя сустрэчы і знаёмствы, якія могуць аказаць істотную дапамогу ў прасоўванні па службе. У аўторак паспрабуйце не ўступаць у канфлікты на працы, пастарайцеся не трапляцца на вочы начальству. У чацвер непажадана заставацца ў адзіноце. Цікавыя зносіны ў гэты дзень пойдуць на карысць і пазбавяць ад дрэнных думак. Можна адправіцца ў вандраванне. У суботу будзе шмат непрадказальнага — падрыхтуйцеся да нечаканасцяў. Падумайце пра тое, што неабходна зрабіць у першую чаргу. Вызваліце для сябе трохі вольнага часу.

ДЗЕВА. Пажадана падумаць над зменай іміджу. Не варта высвятляць адносін з начальствам: не канфліктуйце з ім і, па магчымасці, радзей трапляйцеся яму на вочы. Сачыце за сваімі словамі, паспрабуйце спачатку думаць, а потым гаварыць. Акалічнасці будуць спрыяць перагляду прынцыпаў і стэрэатыпаў паводзін. Поспех прыйдзе да тых, хто займаецца грамадскай дзейнасцю. Больш часу надавайце любімай творчай працы, пакіньце руціну і займайцеся раскрыццём свайго творчага патэнцыялу. Верагодна абвастрэнне адносін з дзецьмі.

ШАЛІ. На вас можа абрынуцца шквал падзей, навін, дзелавых сустрэч, таму варта старанна прадумаць і расклад, і імідж. У аўторак хтосьці або штосьці можа моцна разлаваць, але не варта рваць і кідаць — падумайце, раптам вы зможаце атрымаць з сітуацыі пэўную выгаду, калі будзеце захоўваць спакой. Вас чакае поспех у процілеглага полу, навакольныя будуць захапляцца і сімпатызаваць вам. У канцы тыдня вялікая верагоднасць з'яўлення людзей, якія здольныя паўплываць на ваш лёс.

СКАРПІЁН. У пачатку тыдня можаце пераацаніць свае магчымасці, таму лепш прэвентыўна пазбягаць удзелу ў сур'ёзных і важных мерапрыемствах. Парушэнне планаў і цяжкасці могуць быць звязаныя з тымі людзьмі, з якімі вам давядзецца мець зносіны — нават насуперак ўласнаму жаданню. Неабходна праяўляць ініцыятыву і набываць новы досвед. Варта ўзяць клопат аб дамачадцах на сябе, бо наўрад ці хтосьці зможа зрабіць гэта лепш.

СТРАЛЕЦ. У пачатку тыдня вас можа чакаць часовы зацішак на працы, затое з'явіцца больш часу для наладжвання карысных кантактаў і проста сяброўскіх зносін. У гэты перыяд не праяўляйце залішняга кансерватызму. У сераду не мітусіцеся і паспрабуйце не даваць абяцанняў, бо будзе вельмі цяжка іх выканаць. У чацвер паспрабуйце знізіць нагрузку на працы да мінімуму, нічым сур'ёзным лепш у гэты дзень не займацца. У выхадныя дні асаблівае значэнне набудзе знешні выгляд — пажадана заняцца добраўпарадкаваннем дома або абнаўленнем гардэроба.

КАЗЯРОГ. Таварыскасць і абаянне дапамогуць наладзіць неабходныя кантакты, знайсці новыя дзелавыя сувязі і дадатковыя крыніцы прыбытку. Не ўсе вашы ідэі сустрэнуць разуменне, але, у цэлым, вас будзе чакаць значны поспех. У сераду не варта ганяцца за міражамі, лепш паспрабуйце забяспечыць сабе і навакольным упэўненасць у чысціні вашых намераў. У выхадныя дні пажадана менш грошай траціць на забавы, таму што вельмі хутка гэтыя грошы спатрэбяцца на больш прагматычныя мэты.

ВАДАЛЕЙ. Добры час для пабудовы планаў на будучыню — яны калісьці абавязкова ажыццявяцца. Час змяняць свае погляды на жыццё і пазбаўляцца ад старых стэрэатыпаў. Не бойцеся брацца за доўгатэрміновыя праекты, варта таксама пашырыць замежныя кантакты. Памятайце, што сябры могуць дапамагчы ў прасоўванні па службовай лесвіцы. Час задумацца аб рамонце кватэры. Не забывайце пра прыемнае свецкае кола. Асцярожней з прывабнымі прапановамі.

РЫБЫ. Пачатак тыдня абяцае быць даволі клапотным. Аднак, хутчэй за ўсё, да выхадных мітусня ўтрасецца і вы зможаце адпачыць у добрай кампаніі. Будзьце больш абачлівымі ў выказваннях: навакольныя могуць аказацца залішне ўспрымальнымі да вашых слоў, нават калі ў вас не было жадання кагосьці пакрыўдзіць. Не ігнаруйце меркавання калектыву. У сярэдзіне тыдня магчымыя творчыя дасягненні. У сераду спрыяльна ўладкоўвацца на новую працу, якая дапаможа забяспечыць хуткі кар'ерны рост.

6	7	9	3	1	8	2	4	5
1	2	8	4	5	9	3	7	6
4	3	5	6	7	2	9	1	8
5	9	7	8	4	6	1	2	3
8	6	3	9	2	1	4	5	7
2	4	1	7	3	5	6	8	9
3	5	6	2	8	4	7	9	1
9	1	4	5	6	7	8	3	2
7	8	2	1	9	3	5	6	4

АДКАЗЫ

На сканворд + судоку

Пара гарызанталь: Гарбата. Капялюш. Юкан. Авёс. Тон. Ёгура. Дар. Юр-поў. Пастарунак. Так. Сакта. Перка. Рух. Эль. Анні. Алаш. Ніда. Ласо. Мана. Лак. Эскулап. Пантэон. Ружжо. **На вертыкалі:** Пірэй. Эфіоп. Ружжо. Пасынак. Фанта. Арбат. Шапі. Рэкламa. «Дукан». Алгебра. Амёба. Ion. Люкс. Арал. Кунак. Ліхаса. Шакоўня. Шок. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

НАЛАВІЎ

Жыхар в. Заастравечча, што ў Клецкім раёне, падаўся ў Брэсцкую вобласць і каля в. Лактышы (Ганцавіцкі раён) позна вечарам закінуў сеткі ў абводны канал.

Супрацоўнікі Дзяржінспекцыі браканьера затрымалі, падлічылі ўлоў (266 рыбін) і страты, нанесеныя дзяржаве. Апошнія выліліся ў 11 648 000 рублёў. Салідны ўлоў!

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 12 (674)
аддзел рэкламы 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Дом у Бягомлі, 91 кв. м, вада, выгоды ў доме, цвёрдапаліўны кацёл, гараж, г/п, лазня. 100 км ад Мінска.
Тэл. 8 033 317 39 26.

❒ Дача ў в. Чарняты Мядзельскага раёна, возера 100 м.
Тэл.: 8 02155 51233, 8 029 777 2309.

❒ Дом у Рудзенску. Электрычка Асіповіцкага напрамку — 30 км ад МКАД. Лазня, гараж, майстэрня, усе выгоды ў доме, 21 сотка.
Тэл.: 8 029 313 36 93, 8 029 318 95 73.

❒ Каляска інвалідная з электрапрывадам.
Тэл. 8 044 530 54 74.

❒ Кватэра 2-пакаёвая, 3/5, 47х27х9, Станькава Дзяржынскага раёна, усе выгоды, 100 км ад МКАД.
Тэл. 8 029 854 00 99.

❒ 2-пакаёвая хрушчоўка ў г. Орша, 1-ы паверх, два склепы, лічыльнікі вады, дзверы метал., пакоі асобныя, побач школа, сад, клуб, аўта- і чыгуначны вакзал, рынак, у добрым стане. 16 тыс. у.а.
Тэл. 8 0216 29 52 92 (пасля 18.00).

❒ Зямельны ўчастак для пабудовы, 70 сотак, возера 30 м. Бешанковіцкі р-н, в. Пушкары.
Тэл. 8 02131 334 63.

❒ Колы на гумавым ходзе, бульба буйная 1 т 800 кг і насенная (змешаныя гатункі) 1 т 300 кг.
Тэл. 8 01771 44 356.

❒ Дом з выгодамі ў г. Браслаў.
Тэл. 8 02153 22 907.

❒ Дача па Смалявіцкім напрамку.
Тэл.: 8 029 377 72 71, 8 029 507 72 71.

❒ Кабыла маладая, абучаная, вупраж і воз на гумавых колах.
Тэл. 8 033 631 31 08.

❒ Дом у г. Клецку Мінскай вобл., побач чыгунка, танна. 9 сотак.
Тэл. 8 029 35 78 015.

❒ Газавая пліта «Мора». Добры стан. 40 у.а.
Тэл.: 8 017 331 01 67, 8 025 683 65 57.

❒ Касілка аднаконная.
Тэл. 8 029 855 03 02.

КУПЛЮ

❒ Мотаблок з прычэпам. Абавязкова з 5-гадовым прабегам. Цана дагаворная.
Тэл. 8 01716 34 317.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЫЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

З легендамі — па Беларусі

Экслібрыс «Звязды»

Дучыц, Л.У.
Сакральная геаграфія Беларусі/ Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011. — 384 с.: іл.

Кніга, якая толькі што прыйшла да чытача, дзякуючы руплівасці, падарожным краязнаўчым і навуковым вышукам вядомай даследчыцы, гісторыка Людмілы Дучыц і журналісткі часопіса «Маладосць» Ірыны Клімковіч, уяўляе сабою не проста даведнік, а сапраўдную краязнаўчую энцыклапедыю. Іначай не назавеш зборнік, дзе ў лаканічнай форме раскрываюцца адметнасці ландшафту Беларусі. На старонках «Сакральнай геаграфіі Беларусі» пададзены багаты фальклорны матэрыял, які дазваляе зазірнуць у мінулыя стагоддзі праз веданне пра ўзгоркі, азёры і рэкі, крыніцы, балоты, камяні, дрэвы, гарадзішчы,селішчы, курганы, старыя могілкі, пячоры, падзямеллі, яры, дарогі. Завяршае кнігу раздзел «Міфалогія і гісторыя ў мікратапанімічных назвах і паданнях».



Пэўна, і вам даводзілася сустракацца са Святымі горамі. А ў кнізе Л. Дучыц і І. Клімковіч пададзены аповеды пра аб'екты з гэтай назвай з розных куткоў Беларусі. А яшчэ ж — Красныя Горкі, Дзявочыя, Бабіны і Дзедавы Горы, Княжыя, Каралеўскія і Царскія Горы... Напрыклад, у вёсцы Чудзін Ганцавіцкага раёна на Княжай Гары, так сцвярджае паданне, паляваў князь Радзівіл. А на беразе ракі Пціч у Пухавіцкім раёне на Вялікай Гары жыла некалі княгіня, у якой не было дзяцей. Паміраючы, яна пракляла княжы церам з усім сваім багаццем. На гары каля вёскі Кукурава Бярэзінскага раёна свае каштоўнасці закапала княжна Рагна... «Сакральная геаграфія Беларусі» — выдатны падрожны даведнік для ўсіх, хто свой вольны час аддае вандроўкам па краіне. Гартаючы старонкі па-свойму ўнікальнай кнігі, пераконваешся: харастваю нашай Айчыны — гэта не толькі замкі і іншыя архітэктурныя збудаванні, а яшчэ і адметны геаграфічны ландшафт, які валодае надзвычай багатай гістарычнай памяццю.

Да кожнага раздзела кнігі пададзены спіс літаратуры. А завяршаюць «Сакральную геаграфію Беларусі» паказальнік «Народныя назвы археалагічных і сакральных ландшафтных аб'ектаў Беларусі» і дэталёвы геаграфічны паказальнік, што дадае выданню большую грунтоўнасць, уводзіць яго ў ранг вартага дапаможніка ў вывучэнні гісторыі, геаграфіі і нават літаратуры.

Мікола БЕРЛЕЖ.

БРАЦІК І СЯСТРЫЧКА ЗАГІНУЛІ НА ПАЖАРЫ

У вёсцы Валковічы Талачынскага раёна падчас пажару ў доме, які літаральна быў разбураны, загінулі хлопчык 2007 года нараджэння і яго сястрычка, якая нарадзілася ў 2009-м.

Як паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО**, мяркуемая прычына пажару — дзіцячая гульня з агнём. Пажар адбыўся а трэцяй гадзіне дня. Бацька дзяцей, інвалід другой групы, быў у лесе на нарыхтоўцы дроў. А мама, аператар машыннага даення, вярталася з працы пасля дзённай дойкі. Па дарозе зайшла да сястры. Калі ім стала вядома пра пажар, разам спрабавалі ўвайсці ў дом, напоўнены дымам... У выніку пажару ў доме былі знішчаны дах, столевае перакрыццё, пашкоджаны сцены. Пад будаўнічымі канструкцыямі, якія абрушыліся, былі знойдзены трупы дзяцей.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Бываліцы

Прозвішча само за сябе

Ехалі, змарыліся, згаладаліся. Завярнулі на лясную абочыну. У цяньку пад бярозкай разгарнулі нешта з прэтэнзіяй на абрус. Па-цяперашняму паляну. Яе і сервіравалі. Каўбаска пальцам піханая, салка з ружовай пражылкай, хрумсткія агурочкі з цыбулькай раздражнялі, наганялі апетыт. Яго падагравала і белая галоўка. Разлілі па трыццаць тры кроплі ў пластыкавы посуд. Пашкадавалі, што не чутно звону хрустальнага. Але пайшла цяплом блажэнным.

Адзін з застольшчыкаў смачна крэкнуў з задавальненнем. Занюхаў пахучай скарынкай. І раптам яго азарыла.

— Браткі, гляньце на наш дружны кружок! Прывалюк, Каўбаска, Налівайка, Скавародка, Закускін. Ёсць прычына, каб паміж першай і другой і куля не прашмыгнула. За нашы прозвішчы, якія гавораць самі за сябе!

І па-філасофску заключыў:

— Жывеш — выпіць хочацца, выпіў — жыць хочацца...

А вось установа, дзе гэта супрацьпаказана, дзе ажыццяўляюць лозунг «П'янству — бой!». З потам на твары гэта робяць: загадчык Гаварушка, яго намеснік Трапашка, начальнік аддзела Балтушка, галоўны спецыяліст Даўбешка.

Ім даволі часта даводзіцца бываць у раёне, да кіраўніцтва якім прыйшлі Рыдлёўка, Лапатка, Коўшык і Карамысла. Аднак і ён быў ашарашаны. У яго ўтульны кабінет зазірнулі сталічныя госці. Калі першы назваўся Голадам, ён гэтаму не надаў увагі. А тут следам з'явіліся Холад, Мароз і Смерцін.

Кіраўнік у адчаі абхапіў галаву рукамі:

— Божухна, за што нам такое пакаранне?

Мікалай ШЛОМА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.08	18.26	12.18
Віцебск —	5.58	18.16	12.18
Магілёў —	5.58	18.16	12.18
Гомель —	5.55	18.12	12.17
Гродна —	6.23	18.41	12.18
Брэст —	6.24	18.41	12.17

Месяц

Поўня 19 сакавіка.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Наталлі, Валерыя, Дзмітрыя, Івана, Ілыі, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сяргея, Тараса.*

К. *Катарыны, Багуслава, Захарыя, Паўла, Казіміра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

22 сакавіка

1917 год — выйшаў першы нумар абласной газеты «Гомельская праўда», якая тады называлася «Известия Гомельского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов».



1786 год — нарадзіўся Іахім Лялевель, вядомы польскі гісторык, палітычны дзеяч, род якога паходзіць з Беларусі. Выкладаў у Віленскім універсітэце. Заклікаў да аб'яднання міжнародных дэмакратычных сіл, падтрымаў ініцыятыву стварэння ў Бруселі міжнароднай Дэмакратычнай асацыяцыі. Даследаваў гісторыю Беларусі, іншых краін. Пісаў аб усходне-славянскай культуры, ролі старажытнабеларускай мовы ў ВКЛ. Разам з І. Даніловічам выдаў Статут ВКЛ 1529 года на тагачаснай беларускай мове. Заклаў асновы сучаснай навукі аб кнізе.

Цытата дня:

«Сапраўдная годнасць падобная на раку: чым больш яна глыбокая, тым меней ад яе шуму».

Мішэль дэ Мантэнь (1533—1592), французскі філосаф-гуманіст.

КАЛЫСКА

Калыска (люлька, зыбка) — месца, дзе знаходзіцца дзіця ў першы год пасля нараджэння. Калыска магла быць размешчана на падлозе, магла быць прымацавана да столі, яе выраблялі з дрэва, палатна, плялі з лазы ці саломы, надавалі ёй самыя разнастайныя формы.

● Падчас вырабу калыскі прытрымліваліся строгага правіла: яе павінен быў зрабіць нехта з мужчын сям'і: бацька, дзед або родны дзядзька дзіцяці.

● Калі майстравалі калыску, выбіралі адзін матэрыял; часцей за ўсё гэта былі расліны або дрэвы, якія хуткa растуць: вярба, арэх, «каб так жа хутка расло і дзіця». Калі калыску рабілі з глогу, казалі: «Каб дзіця жыло доўга». У народных казках калыска была з золата ці серабра.

● Забаранялася рабіць калыску да нараджэння першага дзіцяці, бо лічылася, што дзіця тады памрэ.

● У традыцыях усходніх славян было прынята ўпрыгожваць калыску роспісам, інкрустацыяй, разьбой, што, як лічылі нашы продкі, выконвала магічныя ахоўныя функцыі ў дачыненні да дзіцяці.

● Магічнымі якасцямі ў народнай культуры быў надзелены і вочап — шэст, на якім прымацоўвалі калыску да столі. Калі бацькі больш не жадалі мець дзяцей, то з вочапа не здымалі кару і не абсякалі голле.

● У калыску клалі рэчы-абярэгі: нож, нажніцы, крыж, чацвярговаю соль, якая была зашыта ў невялічкі мяшэчак з чырвонай тканіны; над калыскай вешалі чырвоныя паясы, званочкі, мацавалі невялічкі абраз.

● Калыску накрывалі полагам, які часта выраблялі з вэлюму, у якім маці ішла да шлюбу, або з яе спадніцы.

● Калі дзіця першы раз клалі ў люльку, прытрымліваліся цэлага шэрагу правілаў. Часцей за ўсё гэта рабілі толькі пасля хрышчэння. Да таго часу яно магло спаць на ложку з бацькамі, на печы, у рэшаце і г.д.

● Для гэтай, як лічылі нашы продкі, даволі значнай падзеі ў жыцці дзіцяці, выбіралі самы спрыяльны дзень: напрыклад, той, на які ў гэтым годзе прыпадала Раство, каб у далейшым дзіця было «багатае і шчаслівае». І наадварот, «прапускалі» той дзень тыдня, на які ў гэтым жа годзе прыпадала Дабравешчанне.

● У хаце калыску ставілі бліжэй да печы, так, каб дзіця ляжала галавой да парога. Катэгарычна забаранялася, каб на калыску трапляла месяцавае святло.

● Часам калыску выкарыстоўвалі ў рытуалах, якія спрыялі спыненню града, моцнага ветру, мору жывёлы: жанчына брала калыску з дзіцем, абыходзіла ўсю свойскую жывёлу, і казала: «як мая калыска поўная, так поўным будзе мой двор (ці мая хата)!».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

У нашай краіне бывае толькі два віды надвор'я: «Блін, што ж так холадна?!» і «Ды чаго ж так горача?!».

☺

— Мужыкі, што б такое купіць жонцы на дзень нараджэння?

— А чаму ты ў яе не спытаеш?

— Вы што, у мяне і грошай такіх няма!

☺

У клапатлівай мамы сын п'е, паліць, мацюкаецца, але ў шапцы!

☺

Дзве сяброўкі.

— Эла, як табе жывецца ў новым доме?

— Добра. Спачатку, праўда, я адчувала сябе чужой, але нядаўна палаялася ўжо з усімі суседзямі.

☺

Аб'ява ў цырульні:

«Лысыя — паразіты грамадства»!

☺

Ва Украіне.

— Пятро! Колькі будзе два кіло сала і тры кіло сала?

— МАЛА!

☺

Самая лепшая і дзейсная дыета — гэта інтэрнэт! Есці наогул няма калі!



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: rek@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларусь Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1336. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12